М. В. Жуковіч, В. У. Праскаловіч

# Літаратурнае чытанне

## 4

Частка 1



# ПАМЯТКА 1

## Як падрабязна пераказваць прачытаны тэкст

1. Спачатку ўважліва прачытайце тэкст. Запомніце змены ў сюжэце, заўважце ўсе дэталі. Адзначце апорныя словы.
2. Затым складзіце план тэксту.
3. Па складзеным плане перакажыце змест прачытанага.

Каб пераказ атрымаўся цікавым, старайцеся захоўваць у ім асаблівасці пабудовы аповеду (напрыклад, калі гэта казка, то патрэбна выкарыстоўваць зачын, паўторы слоў, дыялогі герояў і іншае). Таксама ўжывайце словы-прыметнікі і словы-дзеясловы з пераносным значэннем, словы з параўнаннем адных прадметаў і з'яў з іншымі.

# ПАМЯТКА 2

## Як выканаць ілюстрацыю да прачытанага літаратурнага твора

1. Выберыце з твора, на ваш погляд, самы цікавы ўрывак. Уявіце сабе галоўных герояў сюжэта (знешні выгляд, пастава, рухі).

2. Успомніце, дзе і калі адбываюцца падзеі. Вызначце патрэбныя аб’екты наваколля. Прадумайце кампазіцыю сюжэта.

3. Падбярыце патрэбны фармат аркуша. Зрабіце на ім накід простым алоўкам (эскізы). Падчас выканання эскізаў памятайце пра неабходнасць выкарыстання вядомых вам выяўленчых сродкаў мастацтва.

4. Выканайце чорна-белы ці рознакаляровы малюнак (на выбар).

# Слоўнік-памочнік для

## Чалавек і прырода

Разнастайныя гукі прыроды, непаўторныя краявіды, прыгажосць прыроды ў розныя поры года, прыродныя з’явы, народныя прыкметы.

## Чалавек і яго род

Продкі, народ, нашчадкі, спадчына, гістарычнае мінулае, бацькоўскі запавет.

## Чалавек і Радзіма

Родны кут, малая радзіма, Айчына, Бацькаўшчына, мілая старонка, сімвалы Беларусі.

# вызначэння тэм твораў

## Чалавек, слова і кніга

Родная беларуская мова, кнігарня, бібліятэка, першадрукар Францыск Скарына, асветнікі Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая.

## Чалавек і мастацтва

Вусная народная творчасць, мастацкая літаратура, карціны жывапісу, музыка, кіно, тэатр, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, помнікі дойлідства, нацыянальныя скарбы.

М. В. Жуковіч, В. У. Праскаловіч

# Літаратурнае чытанне

Падручнік для 4 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй
адукацыі, з беларускай і рускай мовамі
навучання і выхавання

У дзвюх частках

Частка 1

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

МІНСК
Акадэмія адукацыі
2024

УДК 821.161.3.09(075.2=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
Ж86

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра педагогікі і менеджменту адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» (дацэнт кафедры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт *І. М. Слесарава*);

настаўнік пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 11 г. Мазыра» *А. А. Пікуза*;

доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» *І. В. Саверчанка*;

настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» *І. К. Туравец*

**ISBN 978-985-33-0029-1 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-33-0028-4**

© Жуковіч М. В., 2018
© Жуковіч М. В., Праскаловіч В. У., 2024, са змяненнямі
© Афармленне. ДУА «Акадэмія адукацыі», 2024

# Дарагія сябры!

Вы трымаеце ў руках падручнік «Літаратурнае чытанне» для 4-га класа, які складаецца з дзвюх частак. Працуючы па ім, вы пазнаёміцеся з творамі яшчэ невядомых вам пісьменнікаў і больш даведаецеся пра ўжо вядомых вам аўтараў.

У кнігу ўваходзяць як творы вуснай народнай творчасці, так і творы беларускіх аўтараў — вершы, апавяданні, казкі. У іх апавядаецца пра цікавы свет прыроды, пра жыццё нашых продкаў, Радзіму, пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі і іх працу, пра лёс дзяцей і подзвігі герояў у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра космас і Сусвет, пра ролю кніг і мастацтва.

## Як працаваць з падручнікам

Разгледзьце ўважліва вокладку кнігі. Прачытайце, хто з'яўляецца аўтарамі вашага падручніка. Такую прыгожую вокладку намаляваў вядомы беларускі мастак В. В. Дударэнка.

Звярніце ўвагу на форзацы кнігі. Памяткі, змешчаныя на іх, дапамогуць вам у рабоце над літаратурнымі творамі.

Кніга складаецца з 5 вялікіх раздзелаў. У пачатку кожнага раздзела змешчаны эпіграф і навігатар, які скіруе вашу ўвагу на асноўныя моманты пры вывучэнні літаратурных твораў.

Аднавіць у памяці раней вывучаны матэрыял дапаможа рубрыка «Успомніце». У рубрыцы «Маўленчая размінка» прапануецца займальны матэрыял для выпрацоўкі навыкаў беларускага літаратурнага



Правообладатель Академия образования

вымаўлення. Перад літаратурнымі творамі ў «Слоўніку» падаецца тлумачэнне слоў, што пасадзейнічае больш зразумеламу засваенню вывучаемага тэксту.

Дадатковы матэрыял па вывучаемай тэме вы знойдзеце ў рубрыцы «Цікава ведаць». Калі ўзнікне жаданне, можна паспрабаваць дома выканаць «Творчае заданне» або заданне, пазначанае QR-кодам. Вашай увагі таксама патрабуюць рэпрадукцыі карцін мастакоў, малюнкі і фотаздымкі.

Дзякуючы набытым на ўроках літаратурнага чытання ведам і ўменням вы лёгка справіцеся з пытаннямі і заданнямі рубрыкі «Праверце сябе».

Умоўныя абазначэнні дазволяць вам лёгка арыентавацца ў вучэбным і дадатковым матэрыяле.

— слоўнік;

— пытанні і заданні;

— работа ў парах (групах);

— рубрыка «Цікава ведаць»;

— дадатковыя матэрыялы на сайце https://eior.by (4 клас, Літаратурнае чытанне — Тэма ўрока).

Спадзяёмся, што літаратурнае падарожжа будзе для вас па-сапраўднаму захапляльным. Вы атрымаеце асалоду ад чытання твораў беларускай літаратуры і фальклору, і вам адкрыецца чароўны свет роднага слова.

Цікавай вам вандроўкі!

*Аўтары*

# ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Прырода — найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачыма кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мнагалучныя напісы — хіба ж гэта не ёсць шчасце?

*Якуб Колас*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** вобразныя словы і выразы, якія выкарысталі пісьменнікі;

✓ **будзем вучыцца** вызначаць адносіны аўтараў твораў да апісаных падзей і дзеючых асоб; маляваць словамі карціны прыроды, якія паўстаюць перад вачамі падчас чытання.

**Варта задумацца.** Чаму ў сваіх творах пісьменнікі звяртаюцца да розных пор года і прыродных з'яў? Што іх прываблівае ў беларускай прыродзе?



Правообладатель Академия образования

## У свеце прыгожага

1. Уважліва разгледзьце карціну Юрыя Корнікава «Залатая восень».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Які настрой перададзены на карціне Юрыя Корнікава?

2) Чаму мастак назваў яе «Залатая восень»? Як яшчэ можна назваць гэту карціну?

3) Як выглядаюць бярозкі і кусты? Якія дрэвы паказаны зялёнымі і чаму?

4) Якімі фарбамі мастак адлюстраваў неба і траву?

5) Як намалявана на карціне лясная рэчка? Патлумачце, чаму вада ў ёй мае розныя фарбы.

6) Што адлюстравана за паваротам рэчкі?
7) Якія фарбы пераважаюць на гэтай карціне? Чаму?
8) Якія пачуцці выклікае ў вас гэта работа мастака?

**Успомніце.** Якія з’явы прыроды вы ведаеце? Прачытайце загадкі на гэту тэму.

Назавіце раней вывучаныя на ўроках літаратурнага чытання мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў, у якіх расказвалася пра прыродныя з’явы.

Што, на вашу думку, натхняла людзей на стварэнне загадак, вершаў, апавяданняў ці казак аб прыродзе? Паразважайце.

## НАРОДНЫЯ ЗАГАДКІ ПРА З’ЯВЫ ПРЫРОДЫ

1. Стукае, грукае, а нідзе не відаць.

2. Без рук, без ног, а вароты адчыняе.

3. Ляціць без крыл, бяжыць без ног, плыве без ветразя.

4. І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць.

5. Цераз палі, цераз лугі спусціліся канцы дугі.

6. Ехала пані ўначы, пагубляла ключы, сонца ўхапіла, а месяц бачыў.



Правообладатель Академия образования

7. Сівое сукно лезе праз акно.

8. Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног.

9. Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто не бачыць, а ўсякі чуе.

10. Днём акно разбіта, а за ноч устаўлена.

Гдё у ПАЛОНЦЫ

**Творчае заданне.** Складзіце загадку пра любую з'яву прыроды, выкарыстоўваючы адзін з прапанаваных ніжэй спосабаў.

**ЗАГАДКА**

| З дапамогай **пытання** | З дапамогай **апісання** | З дапамогай **супраць-пастаўлення** |
|---|---|---|
| *Што без вады плавае?* | *Сяміколерная стужка ў небе выгнулася дужкай.* | *Ляціць, а не птушка, вые, а не звер.* |
| *(Воблакі.)* | *(Вясёлка.)* | *(Вецер.)* |

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша Міхася Сазончыка «Сонца мыецца», захоўваючы правільнае вымаўленне гукаў [р], [дз’], [г], [ў].

Над зямлёю соннай
Зазвінелі жаўрукі,
Разбудзілі сонца
Тут, на беразе ракі.

Ветрык вее ледзьве.
Неба чыстае, без хмар.
Я падгледзела, як мые
Сонца ў рэчцы твар.

**Успомніце.** Ці даводзілася вам назіраць за ўсходам сонца? Калі і дзе вы бачылі гэту з’яву прыроды? Якія ўражанні атрымалі ад яе?

**Зычлі́вы** — які жадае дабра другому.
**Чырво́нец** — *тут*: манеты, золата, грошы.
**Ша́ты** — *тут*: цені.

## Усход сонца

*Якуб Колас*



На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.

Чуць-чуць дрогне, праліецца
Чырвань на ўсходзе —
Гэта неба ўсміхнецца
Людзям і прыродзе.



Правообладатель Академия образования



Смех адказны, смех шчаслівы
Ходзіць па пагорках.
Час світання — час зычлівы…
Гаснуць, нікнуць зоркі.

Шы́рай, шырай зарані́ца
Разнімае крылле,
Нібы пожар б’е крыніцай
Там, на небасхіле.

Сноп праменняў, пышна ўзняты,
Сее бляск-чырвонцы —
Гэта неба сцеле шаты
На дарогу сонцу.

?

1. Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?
2. Якія малюнкі вы ўяўлялі, калі чыталі твор?
3. Пры дапамозе якіх вобразных слоў перадаецца прыгажосць усходу сонца?
4. Як вы лічыце, што зменіцца ў змесце і настроі верша, калі ў выразе *чырвань дрогне* замест слова *дрогне* ўжыць слова *блісне*?
5. Адшукайце радкі, дзе адзін прадмет (з’ява) параўноўваецца з іншым. Паспрабуйце абгрунтаваць, для чаго аўтар выкарыстоўвае гэты прыём.
6. Падумайце, з якой інтанацыяй, у якім тэмпе трэба чытаць верш.
7. Разгледзьце ілюстрацыю да твора. Якія карціны вы маглі б намаляваць да гэтага верша? Апішыце іх.
8. Вывучыце верш на памяць.

### *У свеце прыгожага*

1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны Архіпа Куі́нджы «Дняпро раніцай».



2. Адкажыце на пытанні.

1) З дапамогай чаго перадаецца мастаком прыгажосць раніцы?

2) Які настрой стварае пейзажыст?

3) Якія радкі з верша Якуба Коласа «Усход сонца» падыходзяць да карціны мастака? Прачытайце іх.

4) Уявіце, што мастаком гэтай карціны з'яўляецеся вы. Як назвалі б гэтую работу? Чаму?

**Творчае заданне.** Паспрабуйце на наступны ўрок па сваім жаданні зрабіць самастойна ілюстрацыю да верша Якуба Коласа «Усход сонца». Выкарыстайце рэкамендацыі памяткі «Як выканаць ілюстрацыю да прачытанага літаратурнага твора» (форзац 1).



Правообладатель Академия образования

**По́плаў** — звычайна заліўны луг.
**Ралля́** — узаранае поле, глеба.
**Умало́тны** — *тут*: багаты на ўраджай.



## Жнівень

*Віктар Гардзей*

Год багаты, умалотны.
Пахне жытам і раллёй.
Жнівень белыя палотны
Рассцілае над зямлёй.

У тумане на балоце
Пратрубілі журавы.
Гай стаіць у пазалоце,
Парыжэлі паплавы.

Над лясамі, над лугамі
Праплыве гусіны клін.
Не змываецца дажджамі
Чырвань яркая з калін.

На хмурынцы гром паехаў
Міма сосен і дубоў.
Многа яблык і арэхаў,
Многа ягад і грыбоў.

Пазбіраюць людзі дбайна
Лета шчодрыя дары.
Сціхлі на палях камбайны —
Загудзелі трактары.



За асінкай, за вярбою
Восень — рыжаю лісой.
Пахне жытам і раллёю
Перад новаю сяўбой.



1. Па якіх прыкметах можна сцвярджаць, што паэт апісвае жнівень? Прывядзіце ў доказ адпаведныя радкі з верша.
2. Апішыце словамі карціны, якія ўзніклі ў вашым уяўленні падчас чытання верша.
3. Адшукайце ў творы і прачытайце радкі, у якіх прадмет ці з'ява параўноўваюцца з іншымі прадметамі.
4. Якія дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні, ажыўляюць жнівеньскую прыроду? Знайдзіце іх.
5. Уважліва разгледзьце фотаздымкі да верша. З якімі радкамі з твора яны сугучны? Знайдзіце і прачытайце іх.
6. Падумайце, з якім настроем і інтанацыяй патрэбна чытаць гэты верш. Якія словы трэба вылучыць голасам? Дзе зрабіць паўзы? Прачытайце верш выразна.



Народнае свята «Дажы́нкі» ў старажытнасці прысвячалася заканчэнню жніва.

Зараз свята «Дажынкі» адзначаюць як свята ўраджаю. У кожным раёне і вобласці нашай Радзімы ўзнагароджваюць хлебаробаў за іх нялёгкую працу. Найлепшых аграрыяў краіны ў пачатку студзеня кожнага года ўрачыста ўшаноўваюць у Палацы Незалежнасці ў Мінску.



Правообладатель Академия образования

**Успомніце.** У папярэдніх класах вы ўжо знаёміліся з вершамі і апавяданнямі на тэму восені. Успомніце іх назвы і аўтараў. Асобныя вершы прачытайце на памяць.

Ці даводзілася вам назіраць такую прыродную з'яву, як бабіна лета? Якія прыкметы гэтай з'явы адлюстраваны на карціне Алены Бархатковай «Бабіна лета»?



**За́пар** — непасрэдна адзін за адным, без пропуску.
**Быльнёг** — рознае буйнасцябловае пустазелле.
**Кузу́рка** — усякае маленькае, дробнае насякомае.



## Бабіна лета

*Рыгор Ігнаценка*

Другі тыдзень запар ідзе дождж. Цярушыць і цярушыць, быццам праз сіта. А то часам і ветрам пацягне, ды такім халодным, што пальцы пачынаюць дубець. Здаецца, яшчэ тыдзень-другі — і на змену дажджу пасыплецца снег, ляжа на зямлю мяккім пухам.

Але зусім нечакана дождж перастаў ісці. Выбліснула сонейка. І ўсё навокал ажыло і павесялела… Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя мяккай задуменнасці і хараства. У паветры плавае павуцінне. Тонкія серабрыстыя валаконцы асядаюць на зямлю, чапляюцца за хмызы, платы, быльнёг. Зямля набывае матава-белы колер, а валаконцы ўсё ткуцца. Паглядзіш у бязмежнае блакітнае асенняе неба і раптам падасца, быццам вось-вось з яго зараз сыпануцца на зямлю чароўныя песні палявых жаваранкаў.

«Бабіна лета настала», — з замілаваннем кажуць у народзе аб гэтай пары восені.

Адчуўшы цяпло, ажываюць шматлікія заснуўшыя было на зіму насякомыя. Зноў з’яўляюцца стракатыя матылькі, мітусяцца ля чыстых люстраных лужын на лясных дарогах хуткакрылыя стракозы, вылазяць з хадоў-лабірынтаў пагрэцца на сонейку лясныя мурашкі. А часам нават прагудзе над адзінокай кветкай калматы чмель, забалбоча на ўзлессі цецярук-касач.

Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў. Хто прадбачліва назапашвае



Правообладатель Академия образования

на зіму карми́, хто спяшаецца цёплае жыллё ўладкаваць, хто проста жыруе, набіраецца сілы.

Большасць птушак ужо адляцела. Ранкамі ў асеннім небе можна пачуць толькі трубныя галасы апошніх жураўлёў. Гэта журботнае курлыканне крылатых вандроўнікаў нельга слухаць без хвалявання. І наўрад ці знойдзецца чалавек, які, пачуўшы гэтыя развітальныя крыкі ў небе, не падыме галавы, не праводзіць жураўлёў доўгім пазіркам.

Але кароткія яны, гэтыя залатыя дзянькі бабінага лета. Глядзіш — зноў схавалася за хмары сонца, падзьмулі вятры, зачасцілі дажджы. І зноў пахаваліся кудысьці падманутыя цяплом усялякія кузуркі, стракозы, мурашкі. У лесе стала ціха і няўтульна.

Бывай, залатая восень!

1. Што вы даведаліся пра бабіна лета? Назавіце прыкметы асенняй з'явы, карыстаючыся тэкстам.
2. Як рэагуюць жывыя насельнікі прыроды на дні бабінага лета? Падмацуйце адказ радкамі твора.
3. Якія пачуцці хацеў перадаць чытачу пісьменнік, апісваючы адлёт жураўлёў?
4. Падумайце, з якой мэтай аўтар апісаў асеннюю з'яву прыроды — бабіна лета.
5. Вызначце, колькі сэнсавых частак у тэксце. Дайце ім загалоўкі.

**Творчае заданне.** Калі вы валодаеце здольнасцямі маляваць, то праілюструйце некаторыя эпізоды апісання восені ў апавяданні «Бабіна лета» Рыгора Ігнаценкі. Пры неабходнасці скарыстайце памятку 2 (форзац 1).

**_Маўленчая размінка._** Пры чытанні верша і загадкі правільна вымаўляйце гукі [дз’], [г], [ў] і падоўжаны [л’].



### Завіруха

Вецер **г**рае на дудзе,
Аж прастор увесь **г**удзе.
Пад такі шалёны **г**рай
Скача бор і скача **г**ай,
Наваколле стогне **г**луха —
Баль спра**ў**ляе завіруха.

*Аляксей Бібіцкі.*

Яна зімой ва**ў**чыцай злой
У полі вые **г**луха,
Ты здагада**ў**ся, дружа мой,
Што **г**эта?

*Міхась Пазнякоў.*

**Успомніце.** Прачытайце вершы пра зіму, якія вы раней вучылі на памяць. Якім настроем яны прасякнуты? Чаму?

**До́світак** — час перад світаннем.
**Ляжа́нка** — шырокі выступ печы для ляжання і ацяплення.
**Дэкламава́ць** — выразна, па-майстэрску чытаць мастацкі твор на памяць.
**Ле́тась** — у мінулым годзе, мінулым летам.
**Бра́ма** — уваход у двор; крытыя зверху вароты.
**Аблаву́шка** — зімовая шапка, вушанка.



Правообладатель Академия образования



# Выпаў снег

*(Скарочана)*

*Іван Грамовіч*

Аднойчы раніцай я прахапіўся і ад нечаканасці аж прысеў на ложку. «Няўжо заспаў?» — мільганула трывожная думка.

У хаце было зусім светла.

Гэтымі асеннімі досвіткамі, доўгімі і цёмнымі, я прывык раненька ўставаць, паўтараць урокі і выходзіць з дому так, каб паспець на заняткі.

Яркае святло дня мяне напалохала. Няўжо спазніўся ў школу?

Але над ложкам гадзіннік... мерна чэкаў, і стрэлка яго паказвала яшчэ не позні час. Ад чаго ж гэта пабялелі столь, ляжанка і печ, і сцены адсвечваюць белізной? Я прынік да шыбы падвойнай рамы акна і ўсё зразумеў.

На двары ўчарашнія змрочныя будынкі, сад, платы́ стаялі аснежаныя, і ў хату ад іх лілося белае мяккае святло. Зямля, стрэхі, агарод накрыліся белым покрывам. Лёгкія пушынкі лёталі, кружыліся ў паветры і асядалі на дрэвы, на аголены куст бэзу ў нашым агародчыку пад акном.

Мяне адразу пацягнула з хаты: я надта люблю гэту часіну...

Я хуценька сабраўся, схапіў кніжкі і пабег.

Яшчэ з парога на мяне дыхнула зіма спакойным халодным подыхам. Наўкол сцішылася ўсё. Сырыя

вятры доўгай восені, якія штодня надакучліва шумелі ў галлі бярозы і секлі мне ў твар кроплямі дажджу, сёння замоўклі. Шчокі цяпер прыемна шчыпаў бадзёры марозік. А снежная бель адбірала вочы, і на сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна.

Сам сабою набег у думках і завярцеўся на языку верш — леташні ўрок, які наша настаўніца, Ліда Васільеўна, загадвала вывучыць на памяць. Я вывучыў яго і дэкламаваў. І цяпер помню словы:

Мяккі снег лятае пухам,
І канца яму няма.
І нясе сярдзітым духам,
Дзікім сіверам зіма...

З кніжкамі пад пахай я спяшаўся ў школу і глядзеў, як кружацца гэтыя белыя пушынкі, і чамусьці мне яшчэ ўявілася тое, што было летась.

Летась зіма была надта снежная. На вуліцы намяло вялікія гурбы. Платы схаваліся пад снегам, і стрэхі зраўняла з сумётамі.

Я аднае раніцы ішоў у школу па тых гурбах, што вышэй акон, вышэй брам. Ішоў на ўзроўні са стрэхамі хат, дзе дымелі коміны, разносячы прыемныя пахі снедання. А дарослыя выходзілі на ганак з вёдрамі і глядзелі на мяне, малога, знізу ўгору. Крочыў з кніжкамі вышэй за ўсіх...

Я нават зачапіўся шапкай за сук Мікітавай ліпы. А Мікітава ліпа стаяла высачэзная, як хмара, над усім сялом. Улетку яе разлапістых галін нельга было дастаць, нават праязджаючы па вуліцы з высокім



Правообладатель Академия образования



возам сена. Яна пышна ўздымалася ўгору, а ў той самы дзень пасля мяцеліцы ніжняй галінай сарвала з мяне аблавушку...

У класе Ліда Васільеўна чытала нам пра першы дзень зімы. А я сабе, паглядаючы ў акно, дзе відаць была Мікітава ліпа, сядзеў і думаў, што гэта ж учора яшчэ была восень. А сёння ўжо зіма. Гэта ж ніколі так не адчуеш перамену, як у гэты дзень. Як вясну лета змяняе, не заўважыш. Як лета восень — таксама. А вось як настае зіма — адразу відно з самага світання... Выпаў снег!..

Мы вярталіся са школы, а снег не пераставаў буйны́мі пушынкамі сыпацца на дол. Кругом было прыволле белых палёў і прастораў. Мае сябры крычалі пра санкі, пра лыжы. Мы кідаліся сне́жкамі, смяяліся. Нам было весела разам з гэтай мяцеліцай, і мне ад радасці хацелася пад разгалістай ліпай спяваць пра снег, пра зіму...

Зіма, зіма! Ідзі хутчэй, сцялі снягі на поле, на дарогі, на нашу вуліцу! Сып, мяцеліца, круці гурбы, каб я зноў даставаў шапкай дрэвы. Вось якія яны высокія, а заўтра мы памераемся!.. Ідзі, зіма-матуля, каб я хутчэй пабольшаў, каб я падрос!..

Вось так я думаў, бегучы са школы, у той дзень, калі выпаў першы снег, калі ўжо сэрцам адчуў, што нешта мінуў, перажыў, а сустракаю хоць знаёмае, але штосьці такое новае-новае...

?

1. Хто апавядае ў творы: аўтар ці яго герой? Дакажыце сваю думку.
2. Раскажыце, што напалохала хлопчыка асеннім досвіткам.
3. Якія малюнкі зімовай прыроды ён убачыў за акном? Знайдзіце адпаведныя радкі ў творы і прачытайце іх.
4. Чаму пісьменнік двойчы паўтарыў у двух сказах слова «белы»: «лілося белае мяккае святло» і «Зямля, стрэхі, агарод накрыліся белым покрывам»?
5. Патлумачце сэнс выразу «А снежная бель адбірала вочы».
6. Адшукайце ў творы радкі, у якіх гаворыцца, што галоўнаму герою дужа падабаецца зіма. Ці блізкае вам такое ўспрыманне гэтай пары года?
7. Якімі вобразнымі словамі і выразамі карыстаецца пісьменнік для апісання зімовай прыроды? Прачытайце іх.
8. Звярніце ўвагу на ілюстрацыю да твора. Здагадайцеся, да якога абзаца яна выканана. Прачытайце адпаведныя радкі. Якія карціны вы маглі б намаляваць да гэтага эпізоду? Апішыце іх.



Правообладатель Академия образования

**Творчае заданне.** Адлюструйце зіму, апісаную ў прачытаным творы, фарбамі на паперы (глядзіце памятку 2, змешчаную на форзацы 1).

### *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Сяргея Ту́тунава «Зіма прыйшла. Дзяцінства».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Як вы думаеце, ці падыходзіць карціна да апавядання Івана Грамовіча «Выпаў снег»? Патлумачце.

2) Па якіх дэталях можна сцвярджаць, што снег за акном выпаў восеньскай раніцай?

3) Якія колеры пераважаюць на палатне мастака?

4) Чаму аўтар так назваў сваю карціну?

5) Які загаловак гэтаму твору жывапісу падабралі б вы, каб былі яго мастаком? Патлумачце.

6) Якія ўражанні выклікала ў вас карціна?

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце і адгадайце загадку. Падчас чытання захоўвайце правільнае вымаўленне гукаў [г], [ч], [ў] і [р].

П**р**аз **г**о**р**ы, даліны,
П**р**аз тыся**ч**ы сёл
З далёкай к**р**аіны
Вя**р**ну**ў**ся пасол.
Спаважны, **ч**ыно**ў**ны,
Ён ста**ў** на ст**р**асе,
У ботах **ч**ы**р**воных,
Каб ба**ч**ылі **ў**се.

**Успомніце.** Якія вершы, апавяданні і казкі пра вясну вы вывучалі ў папярэдніх класах? Якой паўстала перад вамі вясна ў апісанні паэтаў і празаікаў? Ці падабаецца вам гэта пара года?

Дзе і калі вы бачылі і чулі буслоў? Раскажыце, што вам пра іх вядома.

**Узле́ссе** — край лесу.
**Спажы́ва** — *тут*: ежа.
**Журы́цца** — сумаваць, тужыць, маркоціцца.
**Во́ўна** — валасяное покрыва авечак.
**Пра́жа** — ніткі, атрыманыя ў выніку прадзення.
**Трыва́лы** — моцны, які з цяжкасцю паддаецца разбурэнню, псаванню.

***Пафантазіруйце.*** Уважліва разгледзьце ілюстрацыю на с. 25 да твора «Буслы». Здагадайцеся, пра каго і пра што будзе апавядацца ў ім.



Правообладатель Академия образования



# Буслы

*Клаўдзія Каліна*

Здарылася гэта яшчэ ў той час, калі буслы ў наш край рэдка прыляталі і ногі ў іх тады былі не чырвоныя, як цяпер, а белыя.

Аднаго разу вясной прыляцелі яны ў нашу пушчу і селі на сухую верхавіну высокай сасны, што расла на ўзлессі.

— Вось тут і зробім сабе гняздо, — сказаў бусел. — Тут рэчка блізка, балота побач, вужоў і жаб многа, будзе нам і нашым дзецям спажывы даволі.

І пачалі буслы насіць на дрэва сухое ламачча, мох, сталі будаваць сабе дамоўку.

А трэба сказаць, што вясна таго года была няўдалая: то сонца прыпячэ, то снег пойдзе, то мароз ударыць.

Прачнуліся аднойчы бусел з буслiхай на досвітку, а вакол усё снегам пакрыта. Паляцелі яны на балота, хацелі спажыву сабе здабыць, але нічога не знайшлі. Усё замерзла, заледзянела. Памарозілі буслы свае босыя ногі і вярнуліся назад.

А тут новая бяда! Вецер разбурыў і раскідаў гняздо.

Селі птушкі на сасне і зажурыліся.

— Што ж мы з табой будзем рабіць? — загаласіла бусліха. — Давядзецца памерці з голаду і холаду...

Падумаў, падумаў бусел і так адказаў буслісе:

— Не плач, сяброўка дарагая, давай паляцім да людзей. Можа, яны нас пусцяць пагрэцца. Бачыш, вунь, на ўзлессі, хата стаіць. Давай папросімся туды.

А ў той старэнькай хатцы жылі дзед і баба. Ніякае гаспадаркі ў іх не было, адна старая сіва́я авечка. Баба прала з воўны ніткі, рабіла панчохі добрым людзям. А дзед лавіў рыбу. Так яны і жылі.

Тае раніцы дзед з бабай якраз былі ў хаце. Раптам чуюць:

— Тук, тук, тук! — пастукаўся нехта ў дзверы.

— Пайдзі, дзед, паглядзі, хто гэта там стукае, — сказала баба.

Адчыніў дзед дзверы, глядзіць — ажно буслы стаяць. Змерзлі, дрыжаць. То адну, то другую нагу падымаюць...

— Ой, баба, зірні, якія госці да нас прыйшлі! — гукнуў дзед.

— Заходзьце, заходзьце хутчэй у хату, — сказала баба.

Упусцілі дзед з бабай буслоў у хату, абагрэлі, накармілі чым толькі маглі. Паглядзела баба на босыя ногі птушак і кажа:





Правообладатель Академия образования

— Дам я вам, буслы, панчохі цёплыя, каб не мерзлі вашы ногі, а то вёсны ў нас халодныя часта бываюць.

І дала птушкам па пары панчох. Ды толькі панчохі тыя чырвоныя былі, з пафарбаванае пражы.

Надзелі буслы панчохі, і так ім зрабілася добра і цёпла, што і мароз не страшны.

Дзед старое кола на страсе сваёй хаты прыладзіў, і буслы зрабілі сабе новае гняздо, больш надзейнае і трывалае.

Пачалі з таго часу буслы каля людзей трымацца, рабіць свае дамоўкі на стрэхах, на дрэвах, бліжэй да людскіх паселішчаў.

А тыя чырвоныя панчохі, што дала ім добрая бабка, буслы і цяпер носяць.

1. Да прачытанага твора складзіце 1-2 пытанні. Задайце іх адно аднаму. Пачніце са слоў: *дзе, калі, хто, чаму, чым, колькі, што, які.* Адкажыце на пытанні аднакласніка.
2. Якая бяда напаткала буслоў? Прачытайце.
3. Растлумачце значэнне слова «дамоўка». Падбярыце да яго сінонім.
4. Якімі рысамі характару і якасцямі надзелены дзед і баба?
5. Знайдзіце ў тэксце радкі, якія сведчаць аб тым, што пісьменніца хвалюецца за буслоў, любіць іх.
6. Твор «Буслы» з'яўляецца апавяданнем ці казкай? Абгрунтуйце сваю думку.
7. Навучыцеся чытаць казку па ролях. Па магчымасці праінсцэніруйце яе.

## НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

1. Увосень лістота на бярозах пачынае жаўцець з вяршáлін — вясна ранняя, знізу — позняя.

2. Раннія халады ў лістападзе — да ранняй вясны.

3. Калі восенню снег выпадае, вясна будзе ранняя.

**Гарэ́зліва** — весела, з задорам.
**Пратáліна** — месца, дзе растаў снег і агалілася зямля.

## Чаму пралескі сінія

*Ганна Скаржынская-Савіцкая*



Як толькі сышоў снег, у лесе пад густымі ялінамі прарасла Кветка. Яна пацягнулася сваімі шырокімі лісткамі, памахала празрыстай галоўкай і ўсклікнула тоненькім галаском:

— Як цудоўна! Я з'явілася на свет! Я жыву!

Але яе ніхто не пачуў. Высокія ялíны гаманілі паміж сабой, і маленькую Кветачку нават не заўважылі. Раптам з кýпінкі да Кветкі падскочыла Жаба.

— Вось і першая Кветка расцвіла, — задумліва сказала яна, — але чаму ты такая непрыкметная, празрыстая, бясколерная?

— Не ведаю, — сумна адказала Кветка, — можа, я залішне ўзяла вады з расталага снегу, таму празрыстая?

— А як цябе завуць? — спытала Жаба.

— Таксама не ведаю.



Правообладатель Академия образования



— Нецікава з табою, аніякага ўра́жання ад цябе, не хачу я з табой сябраваць, — сказала Жаба і паскака́ла далей.

Кветачцы зрабілася так маркотна і крыўдна, што яна заплакала.

— Хто гэта плача? — здзівіўся сонечны Праменьчык, які ў гэты час гарэзліва скакаў па лапках ялін. Ён разгарнуў лапнік і пабачыў Кветачку.

— Чаго ты плачаш? — спытаў Праменьчык.

— Сумна мне, — усхліпнула Кветка, — я такая непрыгожая, бясколерная, не ведаю, як мяне завуць. Нават Жаба не схацела са мной сябраваць.

---

*Пафантазіруйце.* Ці супакоіць Кветачку Праменьчык? Якім чынам?

---

— Не плач, — усміхнуўся Праменьчык, — завуць цябе Пралеска, таму што расцеш на пералесках і праталінках.

— Пралеска?! — здзівілася Кветка. — Якая прыгожая назва! Але чаму я празрыстая?

— Не хвалюйся, зараз мы гэта паправім, — сказаў Праменьчык.

Ён папрасіў, каб ялінкі расхінуліся, і Пралеска пабачыла прыгожае блакітна-сіняе неба, якое адлюстравалася ў яе празрыстых пялёстках. Пралеска зрабілася сіняй, як неба.

— Якая ты прыгожая! — радасна ўсклікнуў Праменьчык. — Гэта неба падарыла табе такую незвычайную прыгажосць! Цяпер ты будзеш нібы лапінка сіняга неба на зямлі!

— Цудоўна! — заляскала лісткамі шчаслівая Пралеска.

— Я вельмі рада, што табе спадабаўся мой падарунак! — гучна сказала Неба і ласкава ўсміхнулася.

А сонечны Праменьчык пацалаваў Пралеску, і ў гэты момант пасярэдзіне блакітна-сініх пялёсткаў з'явілася жоўтае вочка, якое засвяцілася мноствам маленькіх промнікаў.

З таго часу, як толькі веснавое сонца сагрэе зямлю, на праталінках расцвітаюць першыя веснавыя кветкі, якія завуцца пралескамі.

?

1. З якімі персанажамі вы сустрэліся ў аўтарскай казцы?
2. Калі і дзе з'явілася на свет Пралеска?
3. З-за чаго Жаба не зацікавілася Кветкай? Дакажыце сваю думку адпаведнымі радкамі з тэксту.
4. Чаму пісьменніца не назвала Жабу Жабкай, ласкава, як астатніх герояў твора?
5. Як аднёсся Праменьчык да бяды Кветкі? Якімі якасцямі характару надзяліў яго аўтар?



Правообладатель Академия образования

6. Перачытайце па ролях размову Праменьчыка з Пралескай. Паспрабуйце пры чытанні перадаць сум і крыўду Кветачкі і гарэзлівы настрой Праменьчыка.
7. Якая асноўная думка казкі?
8. Разгледзьце ілюстрацыю (с. 28) да твора. Які эпізод на ёй адлюстраваны? Якія малюнкі можна яшчэ зрабіць да гэтай казкі? Апішыце іх словамі.

**Творчае заданне.** Стварыце з дапамогай фарбаў малюнкі-кадры да мультфільма паводле казкі «Чаму пралескі сінія».

Падзяліце казку на сэнсавыя часткі, складзіце план. Перакажыце яе змест па плане.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем...***

**1.** Якія творы з раздзела вам найбольш спадабаліся і запомніліся?

**2.** Па апорных словах і спалучэннях слоў адгадайце назву апавядання:

а) сонечныя дні, чапляюцца за платы, залатыя дзянькі, галасы жураўлёў;
б) давай паляцім да людзей, рабіла панчохі добрым людзям, змерзлі, дрыжаць, пачалі рабіць свае дамоўкі на стрэхах;
в) прахапіўся раніцай, белае святло, кружыліся ў паветры, ішоў па гурбах, першы снег;
г) празрыстай галоўкай, нецікава з табой, ніякага ўражання ад цябе, сонечны Праменьчык.

**3.** Назавіце аўтара кожнага з пералічаных твораў.

| Назва твора | Аўтар |
|---|---|
| а) «Буслы»<br>б) «Бабіна лета»<br>в) «Выпаў снег»<br>г) «Усход сонца» | 1) Клаўдзія Каліна<br>2) Якуб Колас<br>3) Іван Грамовіч<br>4) Рыгор Ігнаценка |

**4.** Устанавіце адпаведнасць паміж творамі і ўрыўкамі з іх.

| Назва твора | Урывак |
|---|---|
| 1) «Усход сонца» | а) Шырай, шырай зараніца<br>Разнімае крылле,<br>Нібы пожар б'е крыніцай<br>Там, на небасхіле. |
| 2) «Жнівень» | б) На хмурынцы гром паехаў<br>Міма сосен і дубоў.<br>Многа яблык і арэхаў,<br>Многа ягад і грыбоў. |

**5.** Пра якія прыродныя з'явы вы чыталі ў творах гэтага раздзела? Падмацуйце свае выказванні чытаннем урыўкаў з тэкстаў.

**6.** Назавіце творы, у якіх гаворыцца пра восень. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўрыўкаў, якія вам асабліва спадабаліся ў гэтых творах.

**7.** У якіх апавяданнях пісьменнікі так выказалі свае адносіны да прыроды?

а) Гэта журботнае курлыканне крылатых вандроўнікаў нельга слухаць без хвалявання. І наўрад



Правообладатель Академия образования

ці знойдзецца чалавек, які, пачуўшы гэтыя развітальныя крыкі ў небе, не падыме галавы, не праводзіць журавоў доўгім позіркам.

б) Шчокі цяпер прыемна шчыпаў бадзёры марозік. А снежная бель адбірала вочы, і на сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна.

8. Прачытайце ўрывак з верша.

На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.

З дапамогай чаго Якуб Колас стварае вобразную карціну прыроды?

9. Выберыце з прапанаваных пунктаў той, у якім запісана адметнасць верша:

а) наяўнасць апавядання пра падзеі з жыцця героя;
б) рыфмуюцца радкі;
в) выказана павучальнасць у змесце.

***Разважаем...***

1. Якую пару года любіце вы? Чаму? Апішыце яе.

2. Чаму мастакі слова ў сваіх творах ва ўсе часы звяртаюцца да тэмы прыроды?

3. Якімі думкамі хацелі падзяліцца з чытачамі аўтары прачытаных вамі твораў?

4. У артыкуле 55 Асноўнага Закона нашай краіны — Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — запісана: «Ахова прыроднага асяроддзя і беражлівыя адносіны да прыродных рэсурсаў — абавязак кожнага». Як вы разумееце гэта? Патлумачце. Якім чынам вы ўжо сёння можаце ахоўваць і берагчы прыроду?

# ЧАЛАВЕК І ЯГО РОД

Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе.

*Уладзімір Караткевіч*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** словы, якія паказваюць адносіны герояў твораў да Радзімы, да зямлі, на якой нарадзіліся, яе мінулага;

✓ **будзем вучыцца** правільна і выразна чытаць уголас вершы, казкі і апавяданні; характарызаваць дзеючых асоб мастацкіх твораў; маляваць словамі партрэты герояў твораў.

**Варта задумацца.** Чаму кожны з нас павінен цікавіцца і ведаць свае карані, памятаць продкаў?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Валерыя Макарава «Нашы продкі».



2. Адкажыце на пытанні, выкарыстоўваючы неабходныя словы-падказкі.

1) Хто адлюстраваны на малюнку?

2) Якога колеру іх валасы? *(Чорныя, рыжыя, русыя, белыя.)*

3) У што апрануты мужчына і жанчына? *(Кашуля, сукенка.)* Які колер іх адзення? Чым яно ўпрыгожана?

4) Чаму, на вашу думку, мастак паказаў продкаў на фоне лесу і рэчкі?

5) Паразважайце, навошта ў небе намаляваны міфічны бог Пярун.

3. Складзіце слоўныя партрэты нашых продкаў з апорай на карціну і змешчаныя вышэй пытанні.

**Славя́не** — вялікая група роднасных па паходжанні і блізкіх па мове і культуры народаў, якія жывуць у Еўропе і складаюць тры адгалінаванні: усходнеславянскае (рускія, украінцы, беларусы), заходнеславянскае (палякі, чэхі, славакі, лужыча́не), паўднёваславянскае (балгары, сербы, харваты, славенцы, македонцы). Назва «славяне», магчыма, утварылася ад слова «слава».

**Пяру́н** — бог грому і маланкі ва ўсходніх славян.

Ніл Гілевіч нарадзіўся на Лагойшчыне (Мінская вобласць). «Родная мая вёска Слабада, — пісаў пісьменнік, — знаходзіцца ў кіламетрах дванаццаці на паўночны захад ад Лагойска — у маляўнічай узгоркавай мясцовасці. У кніжачцы аднаго краязнаўцы ў пачатку 20-га стагоддзя Лагойшчына называецца “беларускай Швейцарыяй”. Мне зразумелае гэта замілаванне нашымі краявідамі: яны сапраўды надзвычай прыгожыя».

У Ніла Гілевіча было 10 братоў і сясцёр. Дзеці рана далучаліся да працоўнага жыцця, дапамагалі бацькам па гаспадарцы, старэйшыя выхоўвалі малодшых. «Любімым маім заняткам шчаслівай даваеннай



Правообладатель Академия образования

пары, — успамінае пісьменнік, — было чытанне кніг. З дзвюх бібліятэк — школьнай і сельсавецкай — за тры гады я перацягаў напэўна добрую палавіну. Тры гады фашысцкай акупацыі ўспамінаюцца як жахлівы сон. Толькі пазней зразумеў, якім цудам мы засталіся жыць...»

Пасля вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Ніл пайшоў у 5-ы клас. Вучобу ў школе спалучаў з працай паштальёна, таму дзіцячыя і юнацкія ўражанні ад убачанага пасляваеннага вясковага жыцця складуць аснову многіх яго твораў.

Ніл Гілевіч вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Яго кнігі для дарослых і дзяцей перакладзены на рускую, украінскую і балгарскую мовы.



## Я — беларус

*Ніл Гілевіч*

Я — беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я — беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя́:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездармá!

Я — беларус, і я шчаслі́вы,
Што маці мову мне дала́,
Што родных песень пераліўы
І зблізку чую, і здаля́.



Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы́, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!..

?

1. У творах вам сустракаліся словы, якія ўжываюцца нячаста, але іх значэнне пры чытанні зразумелае. Да слова *прашчуры* падбярыце сваё тлумачэнне.
2. Кожнае новае чатырохрадкоўе паэт пачынае паўтарэннем слоў «Я — беларус...». Чаму ён выкарыстаў такі мастацкі прыём?
3. Якімі рысамі характару надзелены беларус? Пацвердзіце свае думкі радкамі з верша. Якія якасці беларускага характару ёсць у вас? Пералічыце іх.
4. У чым галоўны герой твора бачыць сваё шчасце?
5. Паразважайце, ці ўдалося мастаку адлюстраваць на малюнку героя верша. Чаму вы так лічыце?
6. Падумайце, пасля якіх слоў пры чытанні патрэбна рабіць паўзы. З якой інтанацыяй трэба чытаць сказы з клічнікамі?
7. Вывучыце верш на памяць.

**Успомніце.** «Аб добрай славе Беларусі ў свеце знаюць нездарма» — так піша Ніл Гілевіч у вершы. Якімі славутасцямі і дасягненнямі нашай Айчыны мы можам ганарыцца сёння?



Правообладатель Академия образования

**Успомніце.** Ад якога слова паходзяць наступныя словы: *продкі, народ, Радзіма*? Што такое род? Хто складае народ? Паразважайце над гэтымі пытаннямі. Зверце свае адказы са слоўнікам.

**Дба́нне** — праяўленне ўвагі да патрэб каго-небудзь, турбаванне пра каго-, што-небудзь.
**Зухава́ты** — бойкі, удалы.
**Наро́д** — насельніцтва дзяржавы, жыхары краіны.
**Про́дак** — чалавек, які жыў задоўга да сучаснасці; заснавальнік сям'і, роду, племені.
**Род** — некалькі пакаленняў, якія паходзяць ад аднаго продка.
**Спра́ўны** — стаsærанны, добрасумленны.

**Творчае заданне.** Прачытайце загаловак апавядання. Аб чым, на вашу думку, у ім будзе весціся гаворка? Ці гатовы вы ўжо зараз даць адказ на пытанне загалоўка? Чаму?



## Адкуль пайшоў твой род?

*Паводле Барыса Сачанкі*

Што такое жыццё? Дзе́ля чаго даецца яно чалавеку?

Узыходзіць сонца і заходзіць... Святло — цемра, дзень — ноч... І зноў: святло — цемра, дзень — ноч... Прылятаюць з выраю птушкі і адлятаюць у вырай... Зеленеюць дрэвы, кусты і жаўцеюць, скідваюць з сябе лісце... Па́дае ў зямлю зерне, прарастае, дае ўсходы,

і новае зерне — новае насенне... Вясна, лета, восень, зіма... І зноў: вясна, лета, восень, зіма... За адным пакаленнем людзей ідзе яшчэ і яшчэ пакаленне. Што значым усе мы ў гэтым няспынным і вечным кругавароце? У чым сэнс чалавечага жыцця? У каго спытаць? А можа... і не пытаць ні ў кога ні пра што... Жыць, як жылі бацькі, дзяды, прадзеды... А яны... Што ведаем мы пра нашых бацькоў, дзядоў, прадзедаў, свой род, сваіх продкаў і пра іх жыццё-быццё, іхнія думкі і мары, клопат і дбанне?

?

1. Паразважайце і паспрабуйце даць адказы на першыя два пытанні апавядання.
2. Якія словы і выразы выкарыстоўвае пісьменнік, каб паказаць бег часу?
3. Паразважайце, у чым заключаецца сэнс жыцця для вас.
4. Чаму твор заканчваецца пытаннем? Выберыце адказ з прапанаваных варыянтаў:
   а) каб падкрэсліць, наколькі важна ведаць гісторыю сваёй краіны;
   б) даказаць, што кожны чалавек павінен помніць і шанаваць сваіх продкаў;
   в) паказаць, што мы да канца не ведаем нават сваіх родных — бацькоў, дзядоў, не ведаем пра іх думкі, мары і жаданні.

**Творчае заданне.** Складзіце па жаданні невялікі аповед на тэму «Адкуль мой род пайшоў?». Распытайце ў сваіх родных (бабуль, дзядуль ці бацькоў) пра



Правообладатель Академия образования

жыццё і занятkі вашых прадзедаў. Выкарыстайце ў час гутаркі наступныя пытанні:

1) Як звалі вашых прабабуль і прадзядуль па татавай і мамінай лініі?

2) У якіх мясцінах яны жылі?

3) Кім працавалі і чым займаліся?

4) Якімі рысамі характару вызначаліся продкі?

## ЗАГАДКА

Адзін бацька, адна маці і ў яго, і ў мяне.
Ён мне брат, а я яму — не.

### Творчае заданне

**1.** Разгледзьце малюнкі, на якіх адлюстраваны заняткі старажытных продкаў-славян.





**2.** Адкажыце на пытанні.

1) Па чым можна здагадацца, што гэта продкі-славяне?

2) Якія заняткі мужчын прадстаўлены на малюнках? Чым заняты жанчыны? Пры адказе выкарыстоўвайце наступныя словы: *земляробства, паляванне, жывёлагадоўля, рыбалоўства, бортніцтва (збор мёду дзікіх пчол), збіральніцтва, ткацтва, шыццё, прыгатаванне ежы.*

3) Чаму нашы продкі сяліліся каля рэк і лясоў?

4) Навошта людзі абгароджвалі сваё паселішча тоўстымі бярвёнамі (частаколам), абкопвалі равамі, абносілі вялікімі землянымі насыпамі?

**3.** Складзіце апавяданне пра жыццё нашых продкаў па малюнках і змешчаных пытаннях.



Правообладатель Академия образования

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша Лёлі Багдановіч «У школу!», правільна вымаўляючы гукі [ч], [ц’], [дз’], [г], [ў], спалучэнні [шч], [цц].

Ву**ч**ы**ц**еся старанна
І толькі на выдатна.
Хай радуе**цц**а мама,
Бабуля, **дз**ед і тата.
Няхай вас лёс абдыме,
Хай бу**дз**е шлях ваш **г**ладкі,
Будаўнікі краіны,
**Г**історыі на**шч**адкі!

**Нашча́дак** — чалавек будучага пакалення, патомак.
**Пу́ня** — збудаванне для сена.
**Стра́ўнік** — унутраны орган чалавека ці жывёлы.



## Вавёрка піша сачыненне

*Паводле Алеся Карлюкевіча*

Вавёрка Аленка засумавала. Учора настаўнік Чорны Бусел папярэдзіў: «Праз тыдзень я адлятаю ў вырай. Але перш чым пакінуць родную Беларусь, я прашу кожнага вучня напісаць сачыненне на тэму “Мой родны кут”. Раскажыце пра свой род, пра свае любімыя дрэвы, ручаінкі, балацінкі».

Вось гэты клопат і не даваў спакою вавёрцы. «Што я магу напісаць?! — разважала Аленка. — Раніцай вылажу са свайго дупла, размінаю лапкі, абмахваюся хвосцікам. Калі нікога паблізу няма, бягу на самую

вершаліну сасны. Там, у закінутым дупле, ляжаць нанізаныя на галінку сушаныя баравічкі. Матуля забараніла чапаць іх, гаворыць, што гэта — запас на зіму. А я ж толькі кавалачак адгрызу… Якое смакоцце! А пасля вяртаюся ў родную хатку, забіраю ранец, кідаю туды колькі арэшкаў і нясуся ў Лясную школу. З сасны на сасну — і ўжо сяджу за партай. Ніякіх адкрыццяў, ніякіх падарожжаў! Дык што ж пісаць?!»

Вавёрка Аленка прыслухалася, падалося, ці сапраўды недзе паблізу дзяцел грукоча? Пэўна, яе аднакласнік Пятрок…

Пятрок нават не заўважыў, як на галінцы ўладкавалася вавёрка. А тая, як толькі надарылася паўза, загаварыла:

— Перадыхні, Пятрок. Нам жа хутка на ўрок, а ты ўжо так запрацаваўся, што будзеш на «Радзімазнаўстве» дзюбай парту дзяўбці́. Падумаеш, што ўсё яшчэ на дрэве.





Правообладатель Академия образования

— Дык я ж, наадварот. З раніцы зарадку раблю, каб лягчэй на ўроку было вы́седзець.

Вавёрка ўздыхнула. Стрэліла вачанятамі па бака́х. Змахнула хвосцікам пажоўклы лісток, што, пэў́на, пасля дажджу прыклеіўся да галінкі. Зняла́ са спі́ны і ўладкавала так, каб не зваліўся, ранец.

— А ў мяне, Пятрок, бяда. Не магу напісаць сачыненне, пра якое гаварыў Чорны Бусел. Ніяк не ўця́млю, пра што ў ім расказа́ць! А ты што напіса́ў?

Дзяцел ласкава зірнуў на Аленку, прызнаўся:

— Мабыць, і я не напісаў бы, каб не матуля. Яна мне ўсё пра наш род расказала. Патлумачыла, чаму мы ўсе такія працалюбі́вcase.

Пятрок дастаў з ранца, які вісеў на галінцы, прыгожы зялёны сшытак і пачаў чытаць:

— Мая Радзіма — Беларусь. Амаль ніхто з маіх суродзічаў далей таго месца, дзе гняздуе сям'я, ніколі не лятаў. Але ў нашым родзе ведаюць, што дзя́тлы жывуць па ўсёй Беларусі.

А ў бары́, які здаўна́ завуць Блу́жскім, мы жывём шмат стагоддзяў. Рака́, што нясе свае воды праз лес, завецца Свіслаччу. З левага берага раку ахінае вялікі дубовы гай. Разам з бацька́мі я ўжо лётаў туды. Мы з татам вы́дзеўблі некалькі ду́плаў у адным са стары́х дубоў і нанасілі туды жалудоў. Зімой яны нам спатрэбяцца.

Мы любім ціхія мясціны. Стараемся абмінаць чалавечае жытло. Але мы рады бачыць, калі разумна,

з клопатам пра дрэвы і насельнікаў бароў гаспадарыць чалавек у лесе. І нам усім трэба берагчы свой родны кут.

Замоўк Пятрок. Маўчала і вавёрка Аленка. Шумеў толькі лес. Вавёрка першай парушыла маўчанне:

— Пятрок, ты напісаў добрае сачыненне. Прызнацца, ажно заплакаць захацелася. Хоць і мне часам даводзіцца сёе-тое чуць пра ваколіцы ды пра нашу вавёрчыну радню. Але хіба гэта можа зацікавіць каго-небудзь?..

Дзяцел паклаў зялёны сшытак у ранец, павярнуўся да вавёркі:

— Аленка, дарэмна ты сумняваешся. І тваё жыццё, і гісторыя тваіх бацькоў і дзядоў — усё гэта вельмі цікава. Вось ты, пры́кладам, ведаеш, што забіраць з дупла назапа́шаныя вавёркамі на зіму арэхі нельга?.. Хто зробіць гэта — без зубоў да самай старасці застанецца. І стра́ўнік у злодзея будзе балець.






Правообладатель Академия образования

— Не, упершыню чую. Хаця бачу, як матуля арэхі і жалуды на зіму хавае ў стары́х дуплах. Гаворыць, што лепей у розных месцах схаваць ды яшчэ падалей ад роднай хаткі.

— Вось бачу, і ты нешта ўсё ж такі чула. А яшчэ мне асабіста даводзілася бачыць, як вавёркі грыбы збіраюць.

— Сама ўжо неаднойчы махавікі, баравікі, падасінавікі, лісічкі, сыраежкі спрабавала. Ведаю і атрутныя, таму іх ніколі не крана́ю. Ведаю, дзе, пад якім кустом, дрэвам падасінавікі хаваюцца. Загадку нават пра падасінавік магу задаць: «Мале́нькі, удале́нькі, скрозь зямлю прайшоў, чырвоную шапачку знайшоў». А вось з сачыненнем справіцца не магу. Ты б, Пятрок, дапамог мне, — пачала прасіць дзятла Аленка. — Яшчэ ёсць час, сшыткі, аловак у мяне з сабою. І дошчачка ёсць, каб падкласці, калі пісаць будзем.

— Не, Аленка, такое сачыненне кожны павінен сам напіса́ць. Пра свае ваколіцы трэба расказваць. І пра сваю сям'ю, свой род. А хто лепей роднай матулі раскажа пра далёкіх і невядомых табе продкаў?

— Што ж мне Чорнаму Буслу сказаць?

— Мілая Аленка, папрасі ў настаўніка прабачэння, паабяцай, што сачыненне «Мой родны кут» здасі заўтра. А каб паверыў, патлумач яму свой план, раскажы, пра што будзеш матулю распытваць. Усё ў цябе, даражэнькая, атрымаецца...

Вавёрка махнула хвастом і, прыжмурыўшы вочкі, скокнула на суседнюю сасну. Трэба было спяшацца. Можа, яшчэ да школы паспее з матуляй пагутарыць.

***Пафантазіруйце.*** Прыдумайце сюжэт размовы вавёркі Аленкі са сваёй мамай. Што маці-вавёрка раскажа дачцэ пра свой род? Ці паспее Аленка на ўрок? Як яна будзе прасіць у настаўніка прабачэння за нявыкананае дамашняе заданне? Што скажа вавёрачцы Чорны Бусел?

1. Якое дамашняе заданне атрымалі вучні ад настаўніка Чорнага Бусла?
2. Хто з вучняў справіўся з заданнем?
3. Чым апраўдвала вавёрка перад сваім аднакласнікам невыкананне задання? Прачытайце яе думкі і словы. Як яны характарызуюць саму гераіню?
4. Знайдзіце і прачытайце змест сачынення вучнядзятла. Ці спадабалася яно вам? Чаму? Якімі якасцямі характару надзелены дзяцел Пятрок і яго сям'я?
5. Прачытайце размову вавёрачкі і дзятла, што адбылася пасля чытання сачынення. Якімі рысамі характару вызначаюцца абодва героі ў гэтым урыўку? Чаму вам можна павучыцца ў іх?
6. Ці згодны вы са словамі дзятла, што кожны вучань сачыненне пра свой род павінен напісаць сам? Чаму?
7. Разгледзьце малюнкі на с. 43, 45. Якія ўрыўкі яны ілюструюць? Знайдзіце і прачытайце гэтыя ўрыўкі.

## ЗАГАДКА

Стракаты, крылаты — руплівец лясны,
Лекар заўзяты хворай сасны.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Академия образования

**Леге́нда** — вуснае народнае апавяданне аб якой-небудзь падзеі ці чалавеку, не пацверджанае гістарычнымі дакументамі.
**Лунь** — драпежная птушка сямейства ястрабіных, з шаравата-белым апярэннем; мышалоў.
**Калаці́цца** — сварыцца, часам з бойкай.
**Вол** — бык, якога раней скарыстоўвалі на сельскагаспадарчых работах.
**Плы́ткі** — неглыбокі, мелкаводны.
**Е́хаць убро́д** — перапраўляцца з аднаго берага на другі ў неглыбокім месцы ракі, возера.
**Палазы́** — гладкія, коўзкія, загнутыя спераду брусы ў ніжняй частцы саней.
**Церабі́ць** — расчышчаць (дарогу, праход).
**Масці́ць грэ́блю** — рабіць насціл з бярвення або галля для пераезду цераз балота, гразкае месца.
**Не́тры** — непраходныя, глухія мясціны.

## Палешукі і палевікі

*Легенда*

*(Скарочана)*

Было ў бацькі дванаццаць сыноў, ды ўсе яны былі вельмі ўда́лыя хлопцы. Жылі́ ў цёмным лесе, дзе вадзілася шмат усялякага звяр'я, пасвілі сваіх кароў ды лавілі зверыну́.

Суседзі жылі далёка і рэдка рабілі ім шкоду, бо баяліся ўдалых хлопцаў. Жылі тыя разам і слухалі старога бацьку, а ён, ужо сіве́нькі, бы лунь, сядзеў сабе ў кажушку ды камандаваў. І быў у іх лад, і ўсім было добра.

Хлопцы ўсе пажаніліся і мелі шмат дзяцей, але ўсе слухаліся старога, і кожны рабіў сваю справу.

Толькі вось памёр стары́ бацька, і пачалі жанкі сварыцца паміж сабою ды падбухторваць сваіх гаспадароў: дзяліцца ды дзяліцца.

Пачалі браты дзяліцца.

Толькі два малодшыя браты жылі паміж сабою вельмі дру́жна: куды адзін, туды і другі. Не захацелі яны калаці́цца з братамі; кінулі сваю бацькаўшчыну дый пайшлі ў свет шукаць сабе зямлі.

Вось занялі́ ды і пагналі яны свой статак, зрабілі з двух дубоў з карэннямі вялізныя сані, запрэглі дванаццаць пар валоў, наклалі ўсялякага дабра, яшчэ пасадзілі жанок з дзецьмі ды і паехалі па пяску.





Правообладатель Академия образования

Працяглі́ трохі валы́ дый сталі, не могуць цягнуць сані па пяску. Вось большы брат давай падкладваць упоперак пад палазы́ круглыя калодкі. Коцяцца калодкі, і сані паўзуць уперад.

Надакучыла меншаму брату падкладваць калодкі пад палазы, вось ён і кажа:

— Давай, братка, зробім такую прыладу, каб калодкі заўсёды круціліся пад палазамі, — ды зрабілі яны колы.

Лёгка пацяглі валы, так што яшчэ браты самі селі на воз. Едуць яны, едуць і пад'язджаюць да вялікай рэчкі. Шукалі, шукалі, нідзе не знайшлі плыткага месца, каб пераехаць уброд. А тут усхадзілася вялікая бура. Лес раве, бы звер. Вецер ломіць дзераўлякі дый кідае на зямлю і ў раку. Плыве па вадзе дзерава, бы плыты.

Зірнуў на тое малодшы брат ды і здагадаўся, як перабрацца цераз раку. Вось давай яны з братам лавіць на рацэ дзерава, звязваць яго разам і рабіць плыт.

Суняла́ся бура, падагналі яны той плыт шчыльна да берага, запрэглі валоў і ўзвезлі воз на плыт. Стаяць на плыце, кіруюць доўгімі жэрдкамі, а плыт сам і плыве з вадою.

Аднесла плыт далёка, але вось ён і прыстаў да другога берага. Пабачылі каровы, што валы паплылі па рацэ на другі бок, кінуліся яны ў ваду ды і пераплылі цераз раку.

Паехалі браты далей і забраліся ў такі лес, што і канца яму нямашака. Не могуць далей ехаць — лес

не дае. Пачалі яны церабіць дарогу ды масціць грэблі. Але дзе там: чым далей, тым лес гусцее, а ў ім такія нетры, што і выбрацца нельга.

Вось і кажа большы брат:

— Застану́ся я тут, не магу выбрацца з лесу.

І застаўся ён сярод таго лесу. І назвалі яго і дзяцей яго палешукамі.

Малодшы ж брат настойліва працярэбліваў дарогу, масціў грэблі, клаў кладкі і ехаў усё далей. Можа, і цяпер на Палессі яшчэ ёсць тыя прасекі ды грэблі, што нарабіў той упарты чалавек. Ці доўга яны ехалі на сваім возе, як убачылі, што лес пачаў радзець, пачалі трапляцца прагаліны, палянкі ды палі; яны спыніліся там і сталі разрабляць поле. Затым-то і назваліся яны палевікамі.

Потым размножыліся і палешукі, і палевікі, занялі пусты лес дый пачалі жыць адны каля другіх побач...

1. Якімі якасцямі вызначалася сям'я ў пачатку легенды? Прачытайце адпаведныя радкі.
2. Дзякуючы каму ўсе члены сям'і жылі некаторы час мірна і ў дастатку?
3. Што стала прычынамі разладу ў гэтай сям'і?
4. Знайдзіце і прачытайце ў легендзе радкі, дзе апавядаецца, як з'явіліся ў жыцці людзей колы і плыты.
5. Пра што вы даведаліся з прачытанай легенды? Назавіце нумар выбранага адказу.
   1) Як у даўнія часы жылі нашы продкі і вялі сваю гаспадарку.



Правообладатель Академия образования

2) Якімі былі людзі, іх побыт і прырода ў старажытныя часы.
3) Як пасяляліся людзі ў палескім краі.
4) Адкуль узнікла назва *Палессе*.

6. Як з'явіліся на нашай зямлі палешукі і палевікі? Падмацуйце адказ адпаведнымі радкамі з тэксту.
7. Што дапамагло двум малодшым братам і іх сем'ям выжыць у складаных умовах?
8. Якія якасці характару варта пераняць у двух малодшых братоў і вам? Патлумачце сваё меркаванне.

Падзяліце легенду на сэнсавыя часткі. Складзіце план і перакажыце адно аднаму яе змест. (Глядзіце памятку на форзацы 1.)

**Творчае заданне.** Уявіце сябе прафесійным мастаком. Якія ілюстрацыі намалявалі б вы да легенды пра паходжанне палешукоў і палевікоў?

## ЗАГАДКА

Па вуліцы ішлі ўтраіх,
На сцежку завярнулі,
І ў дом зайшло шасцёра ўсіх:
Дзве мамы,
Дзве дачкі,
Пры іх —
З унучкаю бабуля.

*Рыгор Барадулін.*

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце радкі з верша Івана Калесніка «Бацькоўская хата». Правільна вымаўляйце гукі [ц’], [дз’], [р], [ў] і спалучэнне [цц].

Як соладка спі**цца**
У матчынай ха**це**.
Тут месяц гля**дзіцца**,
Тут зоркі **раяцца**.

Тут — шляху пачатак
І сілы к**р**ыніца.
Бацькоўская хата —
**Р**адзімы зямліца...

**Во́дар** — прыемны пах.
**Медуні́ца** — травяністая расліна з дробнымі пахучымі кветкамі.
**Кру́ча** — абрыў, круты спуск.
**Спакваля́** — паволі, спакойна, не спяшаючыся.

## Бацькоўскі парог

*Анатоль Грачанікаў*



Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але на бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся.

Каб сэрцам
Глыбока адчуць,
Як водар
Нясуць медуніцы,



Правообладатель Академия образования



Як сосны
Над кручай гудуць,
Як звоняць
Світальна крыніцы.
Асядзе
Туман спакваля
Крыштальнаю
Чыстай расою.
І дыхае ціха зямля.
Заўсёды
Ёй быць маладою!

Усё,
Што народ наш
Стварыў,
Аберагаць мы
Павінны.
І песню ўраджайную
Ніў,
І мірнае неба
Айчыны.

Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але
На бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся.

1. Пра які бацькоўскі парог ідзе гаворка ў вершы?
2. З якім пачуццём піша паэт пра родны дом і малую радзіму?
3. Чаму аўтар запрашае нас абавязкова вяртацца на бацькоўскі парог? Якімі словамі ён сказаў пра гэта? Як гэта характарызуе самога паэта?
4. Якія словы дапамагаюць Анатолю Грачанікаву «ажывіць» родны кут, надаць яму чалавечыя якасці? Прачытайце.
5. Што ўслаўляе паэт у вершы?
6. Што робяць людзі ў нашай краіне для таго, каб зберагчы «Усё, што народ наш стварыў… і песню ўраджайную ніў, і мірнае неба Айчыны»?
7. Якім настроем прасякнуты твор? Прачытайце верш так, каб слухачам перадаўся адпаведны настрой.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем…***

1. Назавіце аўтара кожнага з пералічаных твораў.

| Назва твора | Аўтар |
|---|---|
| а) «Адкуль пайшоў твой род?»<br>б) «Я — беларус»<br>в) «Ваверка піша сачыненне»<br>г) «Бацькоўскі парог» | 1) Ніл Гілевіч<br>2) Барыс Сачанка<br>3) Алесь Карлюкевіч<br>4) Анатоль Грачанікаў |

2. Назавіце твор, з якога ўзяты наступныя радкі:

а) «Потым размножыліся і палешукі, і палевікі, занялі пусты лес дый пачалі жыць адны каля другіх побач»;



Правообладатель Академия образования

б) «Што значым усе мы ў гэтым няспынным і вечным кругавароце? У чым сэнс чалавечага жыцця? У каго спытаць? А можа… і не пытаць ні ў кога ні пра што…»;

в) Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але
На бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся;

г) Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!..

**3.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і яго жанрам:

| | |
|---|---|
| а) «Адкуль пайшоў твой род?» | 1) казка |
| б) «Ваверка піша сачыненне» | 2) верш |
| в) «Палешукі і палевікі» | 3) апавяданне |
| г) «Я — беларус» | 4) легенда |

**4.** Вызначце, хто і ў якім творы так расказвае пра сябе ці сваю сям'ю:

а) «Раніцай вылажу са свайго дупла, размінаю лапкі, абмахваюся хвосцікам. Калі нікога паблізу няма, бягу на самую вяршаліну сасны. Там, у закінутым дупле, ляжаць нанізаныя на галінку сушаныя баравічкі. Матуля забараніла

чапаць іх, гаворыць, што гэта — запас на зіму. А я ж толькі кавалачак адгрызу... Якое смакоцце!»;

б) «Вось і кажа большы брат:

— Застану́ся я тут, не магу выбрацца з лесу.

І застаўся ён сярод таго лесу. І назвалі яго і дзяцей яго палешукамі»;

в) «А ў бары, які здаўна завуць Блужскім, мы жывём шмат стагоддзяў. Рака, што нясе свае воды праз лес, завецца Свіслаччу. З левага берага раку ахінае вялікі дубовы гай. Разам з бацька́мі я ўжо лётаў туды. Мы з татам выдзеўблі некалькі дуплаў у адным са старых дубоў і нанасілі туды жалудоў. Зімой яны нам спатрэбяцца».

**5.** У якіх творах гэтага раздзела:

а) расказваецца пра казачных вучняў вавёрку Аленку і дзятла Петрака;

б) расказваецца народная легенда пра паходжанне палешукоў і палевікоў;

в) аўтар разважае, што такое жыццё і дзеля чаго яно даецца чалавеку;

г) пісьменнік раіць чытачу захоўваць сувязь з родным домам, малой радзімай?

**6.** У якой паслядоўнасці патрэбна пераставіць пункты плана, каб ён адлюстроўваў змест народнай легенды «Палешукі і палевікі»?

П л а н

1) «Было ў бацькі дванаццаць сыноў».

2) «... дый пачалі жыць адны каля другіх побач».



Правообладатель Академия образования

3) «Толькі два малодшыя браты жылі паміж сабою вельмі дружна».

4) «І застаўся ён сярод таго лесу».

5) «Пачалі браты дзяліцца».

6) «...давай яны з братам лавіць на рацэ дзерава, звязваць яго разам і рабіць плыт».

7) «...яны спыніліся там і сталі разрабляць поле».

8) «Толькі вось памёр стары́ бацька».

9) «...зрабілі яны колы».

### *Разважаем...*

**1.** Чаму кожная сям'я павінна весці свой сямейны радавод і перадаваць яго звесткі наступным пакаленням?

**2.** Хто з нашых продкаў стаў ці можа стаць для вас прыкладам у жыцці?

**3.** Якіх вядомых землякоў вы ведаеце? Раскажыце, чым яны знакаміты. Складзіце вуснае апавяданне пра аднаго з вашых землякоў.

**4.** Якія жыццёвыя ўрокі вы атрымалі пасля вывучэння твораў гэтага раздзела?

**5.** У артыкуле 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь напісана: «Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці». Падумайце, якім чынам вы можаце дапамагчы дарослым выконваць гэты абавязак ужо зараз.



# ЧАЛАВЕК І РАДЗІМА

Радзіма — гэта і сонца ў цябе над галавою, і паветра, якім дыхаем, гэта і вернасць твайго сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў.

*Уладзімір Караткевіч*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** радкі, якія паказваюць адносіны герояў твораў да Радзімы і яе гісторыі;

✓ **будзем вучыцца** прагназаваць змест твора па загалоўку; вызначаць тэму і асноўную думку твораў; знаходзіць у вершах вобразныя словы і выразы, тлумачыць іх значэнне і ролю.

**Варта задумацца.** Чаму сучасны вучань павінен цікавіцца і вывучаць гістарычнае мінулае сваёй Радзімы і роднага краю?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце фотаздымак беларускага пейзажу.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Што вы ўбачылі на гэтым фотаздымку?

2) Якую назву і чаму яму можна даць? Патлумачце.

3) Па якіх прыкметах можна сцвярджаць, што на фотаздымку лета?

4) Як выглядае неба? Апішыце луг, поле, возера.

5) Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас гэты фотаздымак?

*Пафантазіруйце.* Прачытайце загаловак верша. Аб чым можа ісці гаворка ў творы?

## Люблю цябе, Белая Русь

*Уладзімір Карызна*



Жытнёвае поле, лясы і азёры,
Крынічанька ў лузе і ў небе жаўрук…
Услухайся толькі — усё тут гаворыць:
«Люблю цябе, Белая, Белая Русь!»

Ну як не любіць тыя хаты ля гаю,
Ля сініх азёр і палёў залатых,
Дзе хлебам і соллю сяброў сустракаюць
І з песняй праводзяць, як родных сваіх!..

Свет помніць і сёння, як ты ваявала,
Што кожны чацвёрты ў зямлі — беларус.
З сынамі Радзімы Маскву адстаяла,
Жыццё адстаяла, о Белая Русь.

Тут трэба ля гэтых азёр нарадзіцца,
І слухаць гаворку, і бачыць зару,
Каб сэрцам і доляй навек прычасціцца
К табе, мая чыстая Белая Русь!

Па апошніх даных, у Вялікай Айчыннай вайне загінуў кожны трэці беларус, былі разбураны амаль усе гарады, спалена, разрабавана звыш 12 тысяч вёсак і пасёлкаў. Вялікім горам стала вайна для нашай краіны і для кожнай беларускай сям’і.



Правообладатель Академия образования

?

1. Якія з пералічаных у вершы вобразаў паэт называе Белай Руссю?
2. Прачытайце наступныя радкі з верша. Каго меў на ўвазе аўтар, калі іх пісаў?

   *Дзе хлебам і соллю сяброў сустракаюць*
   *І з песняй праводзяць, як родных сваіх!..*

3. Што новага вы даведаліся з верша пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны?
4. Патлумачце значэнне слова «чыстая» ў адносінах да Беларусі.
5. У якіх радках верша выказана асноўная думка?
6. Як патрэбна чытаць гэты твор: хутка, працяжна, весела, з сумам? Чаму вы так думаеце?
7. Вывучыце верш на памяць і паўдзельнічайце ў конкурсе на лепшага чытальніка гэтага твора.
8. Паразважайце, што для вас з’яўляецца вобразам Беларусі. За што вы любіце нашу Радзіму? Раскажыце пра гэта.

**Творчае заданне.** Уявіце, што па змесце верша вы ствараеце кадры кінафільма/мультфільма. Апішыце кожны кадр: месца дзеяння, персанажаў, карціны прыроды.

***У свеце прыгожага***

На словы Уладзіміра Карызны кампазітар Юрый Семяняка напісаў музыку. Паслухайце песню і выкажыце свае ўражанні.

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша «Родныя з'явы» Міхася Пазнякова. Вымаўляйце правільна гукі [р], [дз'], [ц'], [ч] і падоўжаны [л'], спалучэнне [шч].

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Нёман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна.

**Успомніце.** Прачытайце загаловак апавядання. Пра што, на вашу думку, яно напісана? Што вы ведаеце пра Беларусь з урокаў літаратурнага чытання і вучэбнага прадмета «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»?

**Спрадве́ку** — з даўніх пор.
**Адры́нуць** — адысці назад, адступіць.

## Лю́бая мая Беларусь!

*(Скарочана)*

*Паводле Янкі Сіпакова*



Любая Радзіма! Вельмі шаноўная мая Беларусь! Маці наша родная — усіх нас разам і кожнага паасобку! Нізка схіляюся перад табою ў пашане ўжо толькі за тое, што ты заўсёды была, заўсёды ёсць і заўсёды будзеш. Твае палі — самыя хлебада́йныя, твае лугі — самыя духмяныя, твае аблокі — самыя



Правообладатель Академия образования

высокія, твае вятры — самыя ласкавыя, твае крыніцы — самыя чыстыя, твае лясы — самыя прыгожыя, твае людзі — самыя добрыя, а твая зямелька — як лекі нам: прыкладзі да раны — адразу ўсё зажывае...

Вельмі прыгожая наша зямля. У нас шмат лясоў, рэк і рэчак, вялікіх і малых азёраў. З космасу, як сцвярджалі нашы землякі-касманаўты Пятро Клімук і Уладзімір Кавалёнак, Беларусь выглядае зялёнаю-зялёнаю. З блакітнымі ўкрапінамі азёраў — нездарма нашу краіну называюць у свеце сінявокаю.

У нас вельмі цудоўныя людзі — добрыя, ласкавыя, спагадлівыя, працавітыя, сціплыя, вясёлыя, але не бесклапотныя. Мы крыху задумлівыя — час і войны, якія, з рэдкім пастаянствам, праязджаліся па нашай зямлі, навучылі нас думаць пра многае.

У нас не горача і не холадна. У нас не сыра і не суха. Праўда, часам бывае і холадна, і горача, і сыра, і суха. Але ў асноўным — памяркоўна. Бо клімат у нас такі — умерана-кантынентальны!

Твой народ, з якім ты заўсёды і які заўсёды з табою, нязводны. Цябе немагчыма разлучыць з ім, як і яго з табою. Як кару з дрэвам, як птушку з крыламі, як раку з рэчышчам, як траву з зямлёю... Так і кожнага з нас нельга разлучыць з Радзімаю, з роднай зямліцаю. Яе нельга адабраць у нас і прысвоіць нейкаму чужынцу — яна заўсёды адрыне таго, хто не палюбіць яе так, як любім яе мы самі.

І не вер, дружа, калі нехта пачне ганіць і ганьбаваць твой народ. Нашы людзі, як і твае бацька і маці, як твае дзяды, прадзеды і прапрадзеды, — шчырыя,



сумленныя і мудрыя. І ніякія мы не зломкі, не затурканыя, як часам нас хочуць зняважыць незычліўцы. Мы — вялікі і старажытны народ — мудры і светлы, чысты і даверлівы, зычлівы і дабрадушны, памяркоўны і разважлівы. Падобны на іншыя народы свету.

Мы — як блізкія сваякі, родзічы з сербамі. Успамінаем часта пра Дунай — як пра сваю родную раку: «Пры Дунаёчку, пры беражочку, ды там дзяўчына кубачкі мыла»...

Кожны з нас мае радасць ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і да такой зямлі.

Наш славуты старажытны род і наша зычлівая зямля вечныя!



Правообладатель Академия образования

1. З якімі словамі Янка Сіпакоў звяртаецца да Беларусі? Аб чым яны сведчаць?
2. Да якіх вобразаў Радзімы аўтар падабраў слова «самы»? Прачытайце адпаведныя радкі. Ці згодны вы з думкай пісьменніка? Чаму?
3. Чаму нашу Беларусь называюць сінявокай?
4. Якімі якасцямі, на думку пісьменніка, надзелены беларусы? Адказ падмацуйце адпаведнымі словамі з тэксту.
5. У чым аўтар бачыць сувязь нашага народа з народамі свету? Пералічыце адпаведныя факты.
6. Знайдзіце ў тэксце абзацы, у якіх адлюстравана асноўная думка апавядання. Прачытайце іх.
7. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання твора.

**Творчае заданне.** Уявіце, што вы экскурсавод і расказваеце пра нашу Бацькаўшчыну замежным гасцям. Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра адну са славутасцей Беларусі, якая ўваходзіць у Спіс Сусветнай культурнай спадчыны.







***Маўленчая размінка.*** Прачытайце радкі з верша Уладзіміра Карызны «Светлы край». Правільна вымаўляйце гукі [ц’], [с’], [ч], [р] і [г].

**Кр**ай з калыскі любімы:
Каля **сц**ежкі **ч**абор,
Жа**р** асенняй **р**абіны
У блакі**ц**е азё**р**.

Бо**р** палае на вет**р**ы
У сузо**р**’і суніц…
Як жа к**р**ай **г**эты **с**ветлы
Нам з табой не цані**ць**!

**Удзя́ка** — *тут*: падзяка — пачуццё ў адказ на зробленае дабро (увагу, паслугу, дапамогу).

## Дарагая Беларусь

*Пятрусь Броўка*



Слаўлю я свой край любімы,
Незгасальную зару.
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

Залацістыя прасторы,
Незлічона ясных зор,
Рэкі ціхія, азёры,
Галасісты шумны бор!



Правообладатель Академия образования

Ты нас ласкай атуліла,
І я ў шчасці гавару:
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

Не магло мне і прысніцца,
Як ты, родная, узрасла.
Паглядзі, твая сталіца,
Быццам казка, расцвіла.

Наша радасць, наша сіла,
Дзе для ўдзякі слоў збяру?
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!



1. З якімі словамі звяртаецца Пятрусь Броўка да Беларусі? Прачытайце адпаведныя радкі.
2. Якімі вобразамі Беларусі любуецца і захапляецца паэт? Пералічыце.
3. Вылучыце ў вершы прыметнікі і дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні, якія дапамаглі аўтару ажывіць вобраз Беларусі.
4. Да каго вы звычайна звяртаецеся са словамі «дарагая» і «родная»? Што можна сказаць пра асобу паэта, які так ласкава звяртаецца да Радзімы?
5. Ці супадае загаловак верша з яго тэмай і асноўнай думкай? Дакажыце. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам-памочнікам для вызначэння тэм твораў (гл. форзац 2).
6. Якія радкі з твора найбольш падыходзяць да ілюстрацыі на с. 68? Знайдзіце і прачытайце іх.
7. З якой інтанацыяй патрэбна чытаць клічныя і пытальныя сказы? Падрыхтуйце выразнае чытанне верша і прыміце ўдзел у конкурсе на лепшага чытальніка.

**Творчае заданне.** Намалюйце свой любімы куточак Беларусі.

## ПРЫКАЗКІ

1. Адна ў чалавека маці, адна ў яго і Радзіма.
2. Найлепшая вадзіца з роднай крыніцы.
3. На чужой старане і вясна не красна.
4. Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць.
5. Дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся.



Правообладатель Академия образования

**Успомніце.** Разгледзьце фотаздымак. Ці знаёмы вам гэты гістарычны будынак на беразе ракі? Дзе ён знаходзіцца?

Прачытайце загаловак апавядання. Які старажытны горад можна назваць ба́цькам гарадоў беларускіх? Чаму?



**До́йлід** — архітэктар.
**Утраве́лы** — які парос травой.
**Хмызня́к** — кусты, зараснікі дробных маладых дрэўцаў.
**Гекта́р** — плошча ўчастка зямлі 100 на 100 метраў.
**Слы́нны** — славуты; такі, пра якога ўсе ведаюць; агульнавядомы; праслаўлены.
**Стале́ц** — трон, багата аздобленае крэсла на спецыяльным узвышэнні.
**Стро́ма** — круты схіл, абрыў; месца ў рацэ, дзе цячэнне асабліва хуткае.
**Арга́н** — музычны духавы клавішны інструмент, што складаецца з набору труб, у якія мяхамі напампоўваецца паветра.
**Вы́спа** — пясчаны востраў, узгорак.

# Бацька гарадоў беларускіх

*(Урывак)*

*Паводле Навума Гальпяровіча*



Полацк... Услухайся ў само гучанне гэтага слова. Нібы чуецца ў ім і посвіст стралы, і лагоднае перашэптванне хваль Дзвіны, і лёгкі подзьмух ветрыку з блізкіх азёраў. Я гавару «Полацк» — і адразу бачу велічныя абрысы Сафійкі, пра якую Уладзімір Караткевіч напісаў, што яна «плыве над Дзвіной, нібы карабель», і маленькую цэркаўку над Палатой, якая сваёй славай і прыгажосцю зіхаціць на ўвесь свет, бо дойлід Іаан рабіў яе па дамове з самой Еўфрасінняй Полацкай, і вал, і Чырвоны мост...

Я ведаю гэты горад да драбніц, да самага маленькага завулачка, і хачу падзяліцца з вамі шчасцем і радасцю, што мы маем яго для ўсіх беларусаў, для ўсіх добрых людзей.

Дык з чаго пачнём наша падарожжа па Полацку?

Я хвалююся, бы ў першы раз, бо зноў гатовы разам з вамі адчуць той халадок у душы, тое трымценне сэрца і пяшчотную асалоду ад далучэння да вечнасці. Можа, з высокага берага Палаты́ каля Чырвонага моста, утравелага і зарослага хмызнякамі і дрэвамі, дзе было першае полацкае гарадзішча?

Менавіта адсюль пачынаўся Полацк — абнесены драўлянымі сценамі, абведзены валам і ровам, горад, які на той час займаў усяго толькі адзін гектар. Але



Правообладатель Академия образования



Спаса-Праабражэнская царква, г. Полацк

гэта быў магутны і слынны горад, вядомы і ў Кіеве, і ў Канстанцінопалі, і нават сярод далёкіх плямёнаў. А калі на полацкі сталец сеў Рагвалод, незалежны ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада, пачало існаваць Полацкае княства, першая беларуская дзяржава. Менавіта гэты горад разбурыў і заваяваў легендарны князь Уладзімір, які такім чынам адпомсціў за адмову полацкай князёўны Рагнеды выйсці за яго замуж. То была тая Рагнеда, якая потым нарадзіла ад Уладзіміра сыноў Усяслава, Яраслава, якога назвалі Мудрым, Мсціслава і дачок Прадславу і Праміславу. Тая Рагнеда, якой прысвяцілі свае творы знакамітыя пісьменнікі, мастакі і кампазітары.

А цяпер давайце падымемся па вузкай сцяжынцы ўздоўж вала і выйдзем на так званы Верхні замак. Быццам дзве рукі, высока пад неба ўздымае свае вежы храм Святой Сафіі.

Ён раней выглядаў трошкі інакш і быў падобны на аднатыпныя храмы ў Кіеве і Ноўгарадзе. Яго будаўніцтва звязана з імем Усяслава Чарадзея, самай, бадай, велічнай постаці ў беларускай гісторыі. Гэта пра яго піша невядомы аўтар «Слова пра паход Ігаравы», што князь узлятаў арлом пад аблокі. Усяслаў узводзіў храм Святой Сафіі з мэтай узвялічыць родны



Еўфрасіння
Полацкая. Фрэска



Рэпрадукцыя карціны
Язэпа Драздовіча «Усяслаў
Чарадзей пад Гародняй»



Чырвоны мост
цераз раку Палату
ў Полацку

Полацк, зрабіць яго роўняй Кіеву і Ноўгараду. Ён запрасіў для будаўніцтва лепшых дойлідаў. На той час гэта было грандыёзнае збудаванне памерам 26 метраў шырынёй і 31 метр даўжынёй.

Не раз перабудоўваўся Сафійскі сабор, і сённяшняе яго аблічча радуе вока і ўсяляе павагу і гонар. Гэта



Правообладатель Академия образования

самае прыгожае месца ў горадзе на высокай выспе над дзвінскай стромай, куды лічыць абавязковым наведацца кожны, хто бывае ў Полацку. Сёння тут музей і канцэртная зала з магутным арганам.

?

1. З якім пачуццём пісьменнік апавядае пра свой родны горад? Прачытайце адпаведныя радкі. Як яны характарызуюць аўтара?
2. Як вы разумееце словы Уладзіміра Караткевіча пра Сафійскі сабор, які «плыве над Дзвіною, нібы карабель»? Патлумачце.
3. Закончыце сказы назвамі, узятымі з гэтага апавядання:
   а) У Полацку можна палюбавацца помнікамі дойлідства: ..., ..., ... .
   б) Горад праславілі сваёй дзейнасцю вядомыя асобы: ..., ..., ..., ... .
   в) Праз Полацк працякаюць рэкі: ..., ... .
   г) Узнікла Полацкае княства дзякуючы князю ... .
4. З якой мэтай Усяслаў Чарадзей узводзіў храм Святой Сафіі? Як гэты ўчынак характарызуе князя?
5. Знайдзіце ў творы сказ, у якім адлюстравана асноўная думка.
6. Ці супадае загаловак апавядання з яго тэмай? Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам-памочнікам для вызначэння тэм твораў (гл. форзац 2).

**Творчае заданне.** Знайдзіце ў інтэрнэце 3-4 фотаздымкі славутых мясцін Полацкай зямлі. Прадэманструйце і вусна апішыце сваім аднакласнікам іх змест, падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

**Успомніце.** Разгледзьце фотаздымак. Як называецца гэты помнік дойлідства? У якім горадзе ён знаходзіцца?



**Кру́шня** — куча камення.
**По́казка** — гісторыя, расказ, легенда.
**Лучы́на** — доўгая сухая сасновая шчэпка, якой даўней асвятлялі сялянскія хаты.
**Маналі́тны** — моцна згуртаваны; высечаны з суцэльнага каменя.
**Трыву́шчы** — вынослівы, вельмі трывалы.
**Дыя́метр** — адрэзак прамой лініі, якая злучае два пункты акружнасці і праходзіць праз яе цэнтр.
**Падму́рак** — каменная або цагляная кладка пад чым-небудзь; фундамент.
**Байні́ца** — адтуліна (дзірка, праход, шчыліна) у сценах крэпасці ці іншых абарончых збудаваннях для вядзення агню; амбразура.



Правообладатель Академия образования



# Горад з белаю вежаю

*(Урывак)*

*Паводле Алеся Каско*

З якога боку ні пад'язджай, ні падыходзь да гэтага старажытнага горада, першае, што кінецца ў вочы, — камяні́ абапал дарогі і на ўзмежках узгорыстых палёў. Вялікія і малыя, адзінокія і цэлымі кру́шнямі. Па іх і здагадаешся, што блізка — Камяне́ц. А як пашчасціць сустрэць дасведчанага чалавека, дык пачуеш прыгожыя, хоць і страшнаватыя, паказкі пра камяні. Асабліва пра вялізны валун з адмысловымі вокнамі і дзвярыма, за якімі даўным-даўно жыў цар-змей. Галаву ён меў змяіную, а ў астатнім быў звычайны, як мы, і справу рабіў звычайную, патрэбную людзям, — шыў абутак ды вопратку. Толькі на вочы нікому не паказваўся, каб нікога не палохаць і каб трымаць у сакрэце сваё незвычайнае ўмельства. Запа́ліць свечку або лучыну і шые ўсю ноч, а хто надта цікаўны або зайздросны спрабаваў зазірнуць у асветленае акенца, той адразу ж камянеў.

Ды потым цар-змей сам пачаў выходзіць на людзі, бо моцна закахаўся ў красуню Алесю. Каханне і давяло яго да згубы: забіў яго Пярун. Прычым бушавала неба доўга-доўга, пакуль жыхары не пахавалі цела забітага побач з хацінай-валуном. Тое жытло з цягам часу развалілася, рассыпалася, камянёў навокал пабольшала, ацвярдзела, стала камяністаю нават зямля. Такое вось паданне пра паходжанне Камянца.

Калі пра гэта ведаеш, дык з яшчэ большай цікавасцю і хваляваннем набліжаешся да горада, загадзя выглядваеш яго самую яскравую і дзівосную прымету — Камянецкую вежу, у падмурак якой леглі рэшткі змеевай хаціны. Выглядаеш і здзіўляешся: яна таксама цябе «выглядае» вачыма-байніцамі ды строгімі шчылінамі паміж зубцамі, што ўтвараюць велічную карону. А як жа — яна вартава́я, абарончая.

Горад і вежа будаваліся адначасова, у другой палове XIII стагоддзя. Вежа муравалася з каменя і вельмі трывалай цэглы, а ўласна горад рабіўся з бярвенняў. Драўляныя збудаванні, зразумела, не зберагліся, зніклі нават пазнейшыя замкава-палацавыя комплексы, хоць не раз абнаўляліся. Затое Камянецкая вежа, або Камянецкі стоўп, як называюць яе тутэйшыя жыхары, не паддалася ні натуральнаму старэнню, ні стыхіям, ні войнам. Так і стаіць на камяністым пагорку, уражвае сваёй маналітнасцю,





Правообладатель Академия образования

трывушчасцю. Да трыццаці метраў у вышыню, звыш трынаццаці метраў ушыркі (лепш казаць — у вонкавым дыя́метры, бо круглая). Самае ж унушальнае — таўшчыня сцен, аж два з паловаю метры. Паспрабуй прабіць хоць ядрамі, хоць снарадамі!

Яшчэ аднаму дзівішся, наведаўшыся сюды ўпершыню: колеру гэтых самых сцен. З падручнікаў ды з мастацкай літаратуры вежу Камянецкую ведаеш як вежу Белую. І на табе! Яна на бурых камянях, а ўся — з чырвона-карычневай цэглы. Праўда, са слядамі пабелкі, але што з таго! Ну, захацеў нехта пабяліць помнік, прыстасаваць да назвы... Пісьменнік і гісторык Уладзімір Караткевіч чалавека таго лічыў за не́вука і тлумачыў: калісьці ў дрымучых лясах за дзясяткі вёрст адсюль стаяла іншая вартавая вежа — драўляная, складзеная з абчасаных (белых) бярвёнаў. Вось нібыта яна дала назву і Камянецкай вежы, і яшчэ адной славутасці зямлі беларускай — Белавежскай пушчы.

Як бы там ні было, а паэты ды іншыя рамантыкі не адмовяцца ад прыгожага слова: Белая вежа...

Ах, ужо гэта вежа! Не адарвацца, не адвесці вачэй...

1. У якім стагоддзі пачалі будавацца старажытны Камянец і вежа?
2. Раскажыце гісторыю пра паходжанне назвы Камянец, якую апавядае пісьменнік. Выкарыстайце апорныя спалучэнні слоў і сказы: *вялізны валун, жыў цар-змей, змяіная галава, шыў абутак ды вопратку, на вочы не паказваўся, трымаць у сакрэце, шые ўсю ноч,*

*спрабаваў зазірнуць, адразу ж камянеў, моцна закахаўся, забіў Пярун, бушавала неба, пахавалі цела, жытло развалілася, стала камяністаю зямля.*

3. Як выглядае Камянецкая вежа? Знайдзіце і прачытайце яе апісанне.
4. Разгледзьце фотаздымак на с. 75. Ці адрозніваецца апісанне помніка ад яго рэальнай выявы?
5. Як ставіцца Алесь Каско да помніка? *(З расчараваннем, захапленнем, здзіўленнем, цікавасцю.)*
6. Чаму Камянецкую вежу яшчэ называюць Белай? Як Уладзімір Караткевіч тлумачыць такое паходжанне назвы?

### *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце манумент «Смага», які знаходзіцца на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці-героя.





Правообладатель Академия образования

**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Каго ўвасобілі скульптары ў мануменце? Па чым можна меркаваць, што гэта абаронца Брэсцкай крэпасці? Якімі паказаны яго твар і пастава?

2) Якія выразныя дэталі скульптуры сведчаць, што салдат падпоўз да ракі і хоча зачарпнуць вады?

3) Патлумачце, чаму скульптары далі такую назву — «Смага».

4) Які настрой і пачуцці выклікае ў вас гэта скульптура? Чаму?

Вялікая Айчынная вайна для беларусаў пачалася з гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці ранкам 22 чэрвеня 1941 года.

Лета ў той год стаяла незвычайна спякотнае. Водаправод крэпасці быў выведзены са строю ў першы дзень вайны. Ад вострага недахопу вады пакутавалі ўсе ўдзельнікі абароны. А яшчэ вада была неабходна для ахаладжэння кулямётаў. Падыходы да ракі былі перакрыты ворагам. Ноччу берагі асвятлялі пражэктары. Подступы да вады абстрэльваліся. Шмат байцоў і камандзіраў загінулі, спрабуючы прынесці каштоўныя кроплі вады ў крэпасць.

Стваральнікі мемарыяла вырашылі расказаць пра гэту трагедыю майстэрствам скульптара. Постаць салдата, які паўзе да вады з каскай у руцэ, не пакідае нікога абыякавым. Сёння ў працягнутай наперад касцы — жывыя кветкі ад наведвальнікаў крэпасці.

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце верш Васіля Жуковіча «Зямля».

Выразна і правільна вымаўляйце гукі [дж], [ч], [ц’], [ў], [г] і падоўжаны [н’].

**Гляджу** з захапле**нн**ем
на нашу зямлю.
У травах і красках
зямліцу люблю,
і **ў цё**плых завеях
барвовых лісто**ў**,
і **ў ці**шы прасторнай
бухматых сняго**ў**.
Як за**ч**араваны
**гляджу** на зямлю.
За тое, што ба**ч**у,
яе **ў**жо люблю.

**Бухма́ты** — пушысты, махнаты.
**Ірдзе́ць** — рэзка вылучацца сваім ярка-чырвоным колерам; чырванець.

## Люблю

*(Скарочана)*

*Канстанцыя Буйло*



Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых га́яў і лясоў.



Правообладатель Академия образования

І рэчку, што імкліва воды
Імчыць у нязведаную даль,
І схілы берагоў пясчаных,
І яснасць чыстых яе хваль.

Люблю вясну, што ў кветкі, зелень
Аздобіць радасна зямлю,
Буслоў на гнёздах клекатанне
І спеў жаўроначка люблю.

Гарачую спякоту лета
І буру летнюю з дажджом,
Як гром грыміць, а ў чорных хмарах
Маланка зіхаціць агнём.

І восень сумную люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,
Як выйдуць жнеі збожжа жаці,
А касары — на сенакос.

Люблю зіму з яе марозам,
Што вокны прыбярэ ва ўзор,
І белы снег, што, укрыўшы поле,
Ірдзіцца бляскам ясных зор.



...І песню родную люблю я,
Што ў полі жнеі запяюць,
Як гукі звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

Мне тут усё для сэрца міла,
Бо я люблю край родны свой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з першай горкаю слязой.

1. Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?
2. За што паэтэса любіць родны край? Пералічыце.
3. Патлумачце, як вы разумееце сэнс выразаў:
   - Залочаныя збожжам нівы;
   - Люблю зіму з яе марозам,
     Што вокны прыбярэ ва ўзор;
   - І белы снег, што, укрыўшы поле,
     Ірдзіцца бляскам ясных зор.
4. Якое слова і дзеля чаго паўтарае паэтэса амаль у кожным чатырохрадкоўі верша?
5. Чаму Канстанцыя Буйло любіць усе прыродныя з’явы і поры года? Як гэта характарызуе паэтэсу?
6. Верш «Люблю» напісаны больш за сто гадоў таму назад. Якія радкі сведчаць пра даўно мінулы час?
7. Падрыхтуйцеся да конкурсу на лепшага чытальніка верша «Люблю».
8. Распытайце ў сваіх бацькоў, дзе яны нарадзіліся, выраслі. За што яны любяць свой родны край?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Паслухайце песню «Люблю наш край». Ці спадабалася яна вам? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі. Якія вобразы, карціны ўзнікалі перад вашымі вачыма, калі вы слухалі песню?

2. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны Уладзіміра Жданава «Палессе. Вясна на хутары».



3. Адкажыце на пытанні.

1) Чаму на карціне пераважаюць сінія і зялёныя фарбы?

2) Прыдумайце іншую назву карціне. Чаму вы хочаце назваць яе так? Аргументуйце.

3) Якія радкі верша Канстанцыі Буйло «Люблю» сугучны з творам жывапісу Уладзіміра Жданава? Знайдзіце і прачытайце іх.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем...***

**1.** Падбярыце сінонімы да слова «Радзіма».

**2.** Якія прыказкі аб Радзіме вы ведаеце?

**3.** Успомніце, якія апавяданні і вершы пра Бацькаўшчыну вы чыталі.

**4.** Па апорных спалучэннях слоў успомніце назвы твораў:

а) плыве над Дзвіною, бераг Палаты́, незалежны ад Кіева, храм Святой Сафіі, узвялічыць Полацк;

б) вялізны валун, змяіная галава, давяло да згубы, «выглядвае» вачыма-байніцамі, са слядамі пабелкі;

в) з блакітнымі ўкрапінамі азёраў, нельга разлучыць з Радзімаю, вялікі і старажытны народ, мае радасць ганарыцца, называюць у свеце сінявокаю.

**5.** Адкажыце, з якога твора гэтыя радкі:

Слаўлю я свой край любімы,
Незгасальную зару.
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

**6.** Аднавіце прапушчаныя словы. Успомніце аўтараў гэтых твораў:

а) Жытнёвае поле, лясы і ...,
Крынічанька ў лузе і ў небе ...
Услухайся толькі — усё тут ...:
«Люблю цябе, Белая, ... ...!»;

б) Люблю народ наш ...
І хаты ў зелені ...,



Правообладатель Академия образования

Залочаныя збожжам ...,
Шум нашых га́яў і ... .

**7.** Назавіце вывучаныя творы, у якіх апавядаецца:

а) пра славутыя мясціны і вядомых людзей старажытнага Полацка;

б) паходжанне назвы горада Камянца і Камянецкай вежы;

в) прызнанне пісьменніка ў любові да Беларусі;

г) любоў і захапленне паэта Радзімай.

Хто з'яўляецца аўтарам кожнага з твораў?

**8.** Прачытайце ўрывак з верша Петруся Броўкі «Дарагая Беларусь».

Не магло мне і прысніцца,
Як ты, родная, узрасла.
Паглядзі, твая сталіца,
Быццам казка, расцвіла.

Вызначце, якія мастацкія сродкі выкарыстаў паэт, каб так прыгожа сказаць пра сталіцу нашай Радзімы:

а) прыметнікі, ужытыя ў пераносным значэнні;

б) дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні;

в) выразы, з дапамогай якіх адзін прадмет ці з'явы параўноўваюцца з іншымі прадметамі;

г) паўторы слоў.

**9.** Назавіце творы, у якіх галоўная думка выказана аўтарамі так:

а) Наша радасць, наша сіла,
Дзе для ўдзякі слоў збяру?
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!;

б) Мне тут усё для сэрца міла,
Бо я люблю край родны свой...;

в) «Кожны з нас мае радасць ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і да такой зямлі.

Наш славуты старажытны род і наша зычлівая зямля вечныя!»;

г) «...хачу падзяліцца з вамі шчасцем і радасцю, што мы маем яго для ўсіх беларусаў, для ўсіх добрых людзей»;

д) Тут трэба ля гэтых азёр нарадзіцца,
І слухаць гаворку, і бачыць зару,
Каб сэрцам і доляй навек прычасціцца
К табе, мая чыстая Белая Русь!

**10.** Аднавіце прыказкі, злучыўшы іх часткі.

| | |
|---|---|
| 1) На чужой старане | а) хто ў бядзе са сваёй зямелькі не ўцякае. |
| 2) Дзе нарадзіўся, | б) ён вечна ў народзе жыве. |
| 3) Той перамагае, | в) там і прыгадзіўся. |
| 4) Герой ніколі не памрэ — | г) і вясна не красна. |

***Разважаем...***

**1.** Што агульнае вы заўважылі ў апавяданнях Алеся Каско, Навума Гальпяровіча? *(Творы аб'яднаны тэмай гістарычнага мінулага нашай Радзімы; дапамагаюць пазбавіцца ад шкодных звычак; пашыраюць кругагляд чалавека па гісторыі Беларусі; вучаць захоўваць памяць аб героях вайны.)*

**2.** Прачытайце прыказкі і выберыце тыя, што падыходзяць да тэкстаў гэтага раздзела. Абгрунтуйце свой выбар.

а) Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца.

б) Усякай птушцы сваё гняздо міла.



Правообладатель Академия образования

в) Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
г) Скажы, хто твой сябар, я скажу, хто ты.
д) Адна ў чалавека маці, адна ў яго і Радзіма.
е) Каб не спатыкацца, трэба пад ногі прыглядацца.

**3.** Чаму трэба цаніць і берагчы спадчыну: старажытныя будынкі, кнігі, помнікі славутым людзям?

**4.** Паразважайце, чаму кожны чалавек павінен любіць свой край, сваю Радзіму.

**5.** Што такое, на вашу думку, Радзіма?

Сімвалам павагі да традыцый папярэдніх пакаленняў з'яўляецца Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ён адзначаецца 7 лістапада. Гэты святочны дзень прынята сустракаць працоўнымі падарункамі. Традыцыйна да гэтага дня адкрываюцца спартыўныя аб'екты, паліклінікі, дзіцячыя сады, школы, уводзяцца ў строй жылыя дамы, прадпрыемствы. Беларусы сваёй штодзённай працай, розумам і талентам уносяць уклад у развіццё нашай краіны.

Адным з такіх падарункаў беларусам стаў запуск у 2020 годзе Беларускай атамнай электрастанцыі ў пасёлку Астравец Гродзенскай вобласці.



# ЧАЛАВЕК, СЛОВА І КНІГА

Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы.

*Францыск Скарына*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **пазнаёмімся** з прычынамі ўзнікнення новых слоў, іх значэннем, адметнасцямі гаворкі нашага народа;

✓ **будзем вучыцца** вызначаць асноўную думку твораў; характарызаваць героя на аснове яго паводзін, перажыванняў, выказваць свае адносіны да яго; правільна карыстацца словамі маўленчага этыкету ў час размовы з іншымі людзьмі.

**Варта задумацца.** Чаму трэба вывучаць беларускую мову і размаўляць на ёй? Навошта патрэбна чытаць кнігі? Якую ролю яны адыгрываюць у жыцці чалавека?



Правообладатель Академия образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце помнік Францыску Скарыне ў Полацку скульптараў Аляксея Глебава, Ігара Глебава, Андрэя Заспіцкага і архітэктара Вальдэмара Марокіна.



2. Адкажыце на пытанні.

1) У што апрануты першадрукар? Чаму менавіта такое мае адзенне — мантыю і берэт? Аб чым гэта сведчыць?

2) Чаму асветнік як бы абапіраецца на кнігу? Што гэтым, на ваш погляд, хацелі сказаць скульптары?

3) Якім паказаны твар Францыска Скарыны? Чаму ён засяроджаны і задумлівы?

4) Для чаго скульптуру славутага вучонага, першадрукара і лекара ўзнялі на высокі пастамент? Паразважайце.

**Успомніце** творы, прысвечаныя беларускай мове, якія вывучалі раней. Прачытайце асобныя з іх на памяць. Чаму пісьменнікі пастаянна звяртаюцца да тэмы роднага слова? Патлумачце.

Назавіце вядомыя вам беларускія звароты ветлівасці. Калі і ў якіх жыццёвых сітуацыях людзі ўжываюць іх? Прывядзіце прыклады.

**Галіна́** (навукі) — асобная вобласць ведаў, навукі, вытворчасці.
**Стра́ва** — 1. яда; 2. адзін з відаў яды, якія падаецца на снеданне, абед і вячэру.
**Пры́кры** — дакучлівы, непрыемны; назойлівы.
**Га́ньбіць** — зневажаць чыю-небудзь годнасць; асуджаць, няславіць.



Правообладатель Академия образования



# Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі

*Сяргей Зелянко*

Дарагі дружа! Кожная мова свету — гэта сапраўднае багацце, сапраўдны невычэрпны скарб! Скарбніца нашага народа — беларуская мова — таксама поўніцца тысячамі каштоўных зіхатлівых каменьчыкаў — разнастайных слоў і выразаў, пры дапамозе якіх мы выказваем свае думкі.




Склад беларускай скарбніцы, як і любой іншай мовы, пастаянна пашыраецца. Напрыклад, у двухтомным «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы» налічваецца больш за 65 тысяч слоў! Але зараз вучоныя рыхтуюць да выдання новы слоўнік, у якім будзе зафіксавана яшчэ больш моўных адзінак.

Чалавецтва не стаіць на месцы. Пастаянна з'яўляюцца новыя галі́ны навукі і тэхнікі, утвараюцца новыя кірункі культуры і мастацтва, развіваецца прамысловасць, узнікаюць сучасныя віды працоўнай дзейнасці і адпаведна новыя спецыялісты. Людзі ўвесь час вынаходзяць новыя рэчы, зручныя прылады, канструююць разнастайныя машыны і найноўшыя апараты. Для ўсіх гэтых прадметаў і з'яў, безумоўна, патрабуюцца назвы. Вось так са з'яўленнем новых аб'ектаў і прадметаў узнікаюць новыя словы, новыя

найменні, новыя тэрміны і паняцці: *смартфон*, *гіраскутар*, *смарт-гадзіннік*, *сэлфі*, *цюбінг*, *фітбол*, *сім-карта*, *фэйк* і іншыя.

У нашай роднай мове існуюць словы, якія валодаюць неверагоднай сілай. Яны дапамагаюць у любой справе і ствараюць добрае ўражанне пра таго, хто штодня карыстаецца імі. Гэта ветлівыя словы.

Ты ўжо ведаеш некаторыя цудадзейныя словы. Напрыклад, прыгожае слова «дзякуй». Яго мы выкарыстоўваем, калі неабходна выказаць каму-небудзь сваю ўдзячнасць за аказаную паслугу або дапамогу.

Канешне ж, на падзяку трэба ўмець правільна адказаць. У беларускай мове ёсць універсальны адказ, які ты, безумоўна, ведаеш: «Калі ласка!».

Калі ж табе падзякавалі за нейкую драбязу, за нешта такое, што не патрабавала ад цябе вялікіх намаганняў, можна адказаць: «Няма за што!».

А ці ведаеш ты, як правільна звярнуцца да чалавека, які пачынае спажываць нейкую стра́ву, ці да людзей, якія ўжо нешта ядуць?

У нашай роднай мове для такіх сітуацый ёсць адмысловыя пажаданні: «Смачна есці!», «Смачнага вам!», «Хлеб ды соль!».

У жыцці часам здараюцца такія непрыемныя сітуацыі, калі мы робім памылкі або выпадкова крыўдзім кагосьці. Выхаваны чалавек заўсёды прызнае́ віну і просіць прабачэння.

Для такіх выпадкаў у беларускай мове ёсць шэраг выразаў: «Прабачце!», «Выбачайце!», «Даруйце!», «Прашу прабачэння!», «Не крыўдуйце!».



Правообладатель Академия образования

Здавён нашы продкі выкарыстоўвалі ў маўленні разнастайныя прывітальныя і развітальныя выразы з пажаданнем дабра і здароўя.

Пры сустрэчы раніцай і днём казалі адзін аднаму: «Добры дзень!» («Дабры́дзень!»), «Добрага дня!» або «Дзень добры!».

Калі сустрэча адбывалася вечарам — «Добры вечар!» або «Вечар добры!». Перад сном жадалі адзін аднаму: «Дабра́нач!», «Добрай ночы!».

А вось вітанне «Добрай раніцы!» нашы продкі не выкарыстоўвалі. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што гэты выраз наогул беларускай мове не ўласцівы.

Замежныя вучоныя лічаць беларускую мову адной з самых прыемных для ўспрымання на слых моў свету — другой па мілагучнасці пасля італьянскай. Да такой высновы прыйшлі даследчыкі спецыяльнай установы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

Дарагі дружа, а ці задумваўся ты калі-небудзь, якую літару беларускай азбукі можна лічыць самай адметнай? Напэўна, большасць людзей, калі ім задаць такое пытанне, назвалі б літару ***ў*** (у нескладовае). І гэта невыпадкова. Падобнай літары няма ў алфавітах нашых блізкіх суседзяў — рускіх і ўкраінцаў, азбукі якіх вельмі падобныя да нашай. І вымавіць адпаведны гук правільна ў іх не заўсёды атрымліваецца. Менавіта таму літару ***ў*** можна назваць самай адметнай беларускай літарай.

У 2003 годзе ў Полацку, самым старажытным беларускім горадзе, літары ***ў*** быў устаноўлены помнік.



Дарагі дружа, спадзяюся, што з тваіх вуснаў ніколі не прагучаць пры́крыя словы, што ты ніколі не зробіш нечага, што зга́ньбіць родную беларускую мову ці іншую. Паважай сябе, сваіх суайчыннікаў і людзей іншых нацыянальнасцей. Любі родную мову і абавязкова вывучай замежныя!

Апавяданне «Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі», са зместам якога вы пазнаёміліся, узята з кнігі Сяргея Зелянко «Таямніцы беларускай мовы». У ёй зможаце даведацца пра цікавыя звесткі з гісторыі беларускай мовы, пра паходжанне некаторых літар беларускага алфавіта, арфаграфічныя правілы. У кнізе ёсць шмат займальных заданняў, выкананне якіх абавязкова прывядзе вас да поспеху.

1. Чаму Сяргей Зелянко называе беларускую мову скарбніцай нашага народа?
2. Па чым можна меркаваць пра багацце любой мовы свету? З якой мэтай ствараюцца слоўнікі?



Правообладатель Академия образования

3. Знайдзіце ў тэксце інфармацыю пра ўзнікненне новых слоў, найменняў, тэрмінаў і паняццяў у нашай мове.
4. Здагадайцеся пра значэнне новых слоў па прыведзеных апісаннях. Падказкі шукайце ў прачытаным тэксце:
   - электрычны транспартны сродак у выглядзе дзвюх злучаных папярэчных пляцовак для ступняў, рухомых адносна адна адной, з калёсамі па бака́х;
   - катанне на надзіманых санках па снезе або вадзе;
   - нешта падманнае, несапраўднае, якое выдаецца за рэальнае, дакладнае з мэтай увесці ў зман;
   - разумны мабільны тэлефон, з дапамогай якога можна тэлефанаваць, адпраўляць лісты, знаходзіць разнастайныя праграмы, гульні, здымаць фота і відэа, карыстацца інтэрнэтам;
   - фотаздымак самога сябе, які зроблены часцей за ўсё на смартфон і выкладзены ў сацыяльныя сеткі;
   - вялікі мяккі мяч дыяметрам 45—90 см, які прызначаны для заняткаў фітнесам і аэробікай;
   - камп'ютарызаваны наручны гадзіннік з магчымасцю рабіць фота, выкарыстоўваць відэакамеру, дыктафон, радыё, навігатар і іншае;
   - невялікія карты з наяўнасцю чыпа, якія неабходны для ўстаўкі ў мабільны тэлефон.
5. Што цікавага вы даведаліся пра цудадзейныя (ветлівыя) словы нашай роднай мовы? Якую ролю яны выконваюць у жыцці людзей?
6. Уявіце, што людзі раптам перасталі ўжываць ветлівыя словы. Ці змянілася б наша жыццё? Абгрунтуйце свой адказ.

7. У чым адметнасць беларускай літары ***ў*** (у нескладовае)? Чаму менавіта ёй устаноўлены помнік?
8. Ці згодны вы з думкамі, выказанымі ў апошнім абзацы тэксту? Чаму? Як яны характарызуюць асобу аўтара?

**Творчае заданне.** 11 студзеня адзначаецца міжнароднае свята, прысвечанае аднаму ветліваму слову. Даведайцеся, як яно гучыць на беларускай мове. Складзіце дыялог з выкарыстаннем гэтага слова.

Якія ветлівыя словы вы ўжываеце ў зносінах з роднымі, сябрамі? Пры дапамозе алоўкаў стварыце на лісце колеравую выяву аднаго з ветлівых слоў. Якія колеры вам спатрэбяцца? Абгрунтуйце свой выбар.

У свеце існуе *Міжнародны дзень «дзякуй»*. Ён быў заснаваны па ініцыятыве Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) з мэтай нагадаць людзям пра каштоўнасць добрых манер, іх неабходнасць у паўсядзённым жыцці.

Свята ветлівага слова «дзякуй» адзначаецца 11 студзеня. У гэты дзень людзі пасылаюць адзін аднаму віншавальныя паштоўкі і паведамленні, каб яшчэ раз нагадаць, як важна ў нашым жыцці сказаць *«дзякуй»*.

Падумайце, каму і за што вы хацелі б адправіць СМС-паведамленне са словамі ўдзячнасці. Раскажыце пра гэта.



Правообладатель Академия образования

**Творчае заданне.** Складзіце дыялог з суседам па парце з ужываннем выразу «Калі ласка».

Уявіце сітуацыю, што ў вас закончыўся запас сшыткаў у лінейку для выканання дамашняга задання па беларускай мове. Вечарам вы прыйшлі да свайго аднакласніка-суседа, каб пазычыць патрэбны сшытак. Як вы будзеце вечарам вітацца з бацькамі аднакласніка? Як будзеце прасіць сшытак? Што скажа ў адказ ваш аднакласнік? Як будзеце дзякаваць суседзям? Што скажаце ім пры развітанні?

Звярніцеся да «воблака слоў». Вызначце, калі трэба выкарыстоўваць кожны з гэтых зваротаў і слоў ветлівасці.

Паразважайце, чаму лёгка жыць з ветлівымі словамі.



**Ахіну́ць** — ахутаць, агарнуць чым-небудзь з усіх бакоў.
**Бай** — міфічная істота дзіцячага фальклору, якая бае байкі.
**Вераця́но́** — прылада для ручнога прадзення ў выглядзе круглай драўлянай палачкі з завостранымі канцамі, патоўшчанай унізе.
**Куфэ́рак** — невялікі куфар, скрынка.
**Ве́ка** — верхняя частка пасудзіны; накрыўка.
**Марко́ціцца** — сумаваць, тужыць, журыцца.
**Нудзі́цца** — *тут*: тое, што і маркоціцца.
**Маладзі́к** — малады месяц у выглядзе сярпа.
**Ру́піцца** — клапаціцца, старацца.
**Завіту́шкі** — што-небудзь у форме спіралі, закручанай лініі.

## Як з’явіўся апостраф

*Алена Масла*



Было гэта даўным-даўно. Можа, толькі сівы́я тума́ны праўду і па́мятаюць. Спрадвеку ахінаюць яны зямлю сваімі калыханкамі, усе яе таямніцы ім вядомыя. Захацеўшы, столькі расказаць могуць, што нават Бай мех з іх казкамі не тое што панесці — з месца скрануць не зможа.

Мы ж з вамі паслухаем толькі адну гісторыю — пра тое, як з’явіўся апостраф. Я пачну кудзелю з туманоў прасці, а вы ўважліва слухайце, як вераценца спявае, тумановыя гісторыі пераказвае...

На той час, калі ўсё на зямлі ўжо было створана, але яшчэ не было названа, у куфэрку, згубленым



Правообладатель Академия образования

у моры-акіяне, жылі словы. Многа іх было — не злічыць. Але ж куфэрак быў вялізны, словы шчыльненька туліліся адно да аднаго — вось усе і змяшчаліся пад адным вечкам.

Аднак проста сядзець — і цесна, і сумна!

— Мусіць жа, мы дзеля нечага створаныя? — шапталіся паміж сабой словы і маркоціліся.

Аднаго разу пачуў гамонку слоў Вецер. А ён, як і туманы, старэйшы за нас з вамі, старэйшы за дрэвы і траву. Нават, можа, за зоркі старэйшы. Дык вось Вецер, які ўсё ведаў, сказаў словам:

— Не ваша гэта доля — нудзіцца тут, далёка ад свету, на востраве, згубленым у моры-акіяне. Ваша доля — па зямлі рассыпа́цца, усяму на ёй імёны даць.

— А як жа мы даведаемся, куды ісці? — занепакоіліся словы. — Мы ж нічога, акрамя свайго куфэрка, не бачылі.

— Э, не турбуйцеся! — сказаў Вецер. — Спачатку куфэрак адчыню, а пасля падумаем.

Як сказаў Вецер, так і зрабіў. А словам боязна ў невядомы свет ляцець з утульнага куфэрка, прыціхлі, маўчаць. Аж чуюць — раптам пытае нехта:

— Што рабілі? Што робім? Што будзем рабіць?

— О, дружа, цябе мы й чакалі! — радасна загуў Вецер, пазнаўшы Дзеяслова, адвечнага рупліўца. Хто-хто, а ён ведае, чым слоўцы заняць, бо сам дзеянне слоў абазначае, таму Дзеясловам і завецца.

Пакуль яго сваякі ў куфэрку нудзіліся, Дзеяслоў ужо тупаў па зямлі, работы сабе шукаў.

— Што рабілі? У куфэрку бесклапотна марнаваліся... Што зрабілі? Вечка куфэрка адчынілі... А што будзем рабіць — ад цябе, дружа, залежыць, — адказваў тым часам на запытанне Дзеяслова Вецер. — Глянь, колькі дабра ў куфэрку прападае! Прыладкаваць бы яго, па свеце разнесці!..

— Будзе зроблена! — паабяцаў Дзеяслоў.

Разам з Ветрам ён спакава́ў словы ў вялікую торбу, сеў у човен, пераплыў мора-акіян і пакрочыў па зямлі. Што на сваім шляху ні сустрэне — слоўцы на тое прымярае, выбірае, каб дакладна падыходзілі жывой істоце, прадмету ці з'яве. Вось так і стала дрэва — дрэвам, рака — ракой, гара — гарой, а вы, мае харошыя, — хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Тупаў, тупаў Дзеяслоў, паўзямлі абышоў і трапіў у тыя мясціны, дзе і сёння ёсць наша з вамі зямля — Беларусь.





Правообладатель Академия образования

А тут лясоў багата, кветкамі травы перавітыя, сінь нябесная ў рэчкі і азёры пералітая... Не можа налюбавацца хараством гэтай зямлі Дзеяслоў, самыя пяшчотныя і прыгожыя словы для яе знаходзіць.

А на двары — ноч. Неба зоркамі ўсеяна. І бачыць Дзеяслоў, што адна з іх за ражок маладзіка зачапілася і, адлюстраваўшыся ў расінках на траве, памножылася, быццам мільёны зорак заззялі.

Прыгожа! Не часта такое ўбачыш! Стаў Дзеяслоў думаць, куды б гэта багацце прыладкаваць. І надумаў: давай шчыраваць, кропелькі з адлюстраваннем месяца і зоркі збіраць ды, як завушнічкамі, словы імі аздабляць...

Як сустрэнеце цяпер, сябры, апостраф у словах, ведайце — гэта і ёсць адбіткі зоркі і месяца, сабраныя Дзеясловам і ўплеценыя ў мову.

Сталі завушнічкі ў словах звінець крышталём начной расы, пералівацца месяцовым ззяннем, клікаць за сабой у нябесную высь, да зорак. І без таго прыгожыя, сталі словы звонкімі, як салаўіныя песні, на якіх начная раса замешаная.

У пару́ Дзеяслоў парупі́ўся! Хутка світаць пачало — летнія ночы, ведама ж, кароткія. Зорка, пацалаваўшы месячык на развітанне, пакацілася па небе. І кажуць, што больш так і не сабралася пакалыхацца ў яго на ражку.

Дзеяслоў жа крышку задрамаў на самым досвітку і, абудзіўшыся, далей па зямлі пакрочыў. Да той пары тупаў, пакуль усе слоўцы не прыладкаваў як след.

А яго падарунак — спеўную беларускую мову, аздобленую апострафамі-завітушкамі, — мы і сёння захоўваем як самы дарагі скарб.

1. Складзіце 1-2 пытанні па змесце прачытанай казкі. Пачніце іх словамі: *калі, дзе, чаму, хто, у каго, як, якую.*
2. Знайдзіце ў казцы зачын. Якія малюнкі вы ўяўлялі падчас яго чытання? Вусна апішыце іх.
3. Знайдзіце ў зачыне словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Якую ролю яны тут адыгрываюць?
4. Што найбольш турбавала словы, якія жылі ў куфэрку? Аб чым гэта сведчыць?
5. Што зрабіў Вецер, пачуўшы гамонку слоў? Прачытайце дыялог, які адбыўся паміж Ветрам і словамі.
6. Якім вам уяўляецца Дзеяслоў? Як аднёсся ён да праблем сваякоў? Пракаменціруйце аўтарскае стаўленне да Дзеяслова, спасылаючыся на тэкст.
7. Знайдзіце ў казцы сказ, у якім адлюстравана яе асноўная думка.
8. Перастаўце пункты плана так, каб ён адлюстроўваў правільны парадак апісаных у казцы падзей.

П л а н

1. Дапамога мудрага Ветру.
2. Самы дарагі скарб.
3. Адна гісторыя.
4. Добрыя справы Дзеяслова.
5. У куфэрку.
6. Знаёмства з Дзеясловам.



Правообладатель Академия образования

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша Петруся Мака́ля «Родная мова». Правільна вымаўляйце гукі [ў], [ц’], [г], [с’]; спалучэнні літар ***тч*** і ***дч*** перадавайце як [чч].

Як самую звонкую **ў свеце** навуку,
Як ройных вякоў пчаліную склад**ч**ыну,
Прымаю па складу, па смаку, па **гуку**
Мову маю ма**тч**ыну!

**Бе́зліч** — незлічонае мноства, вялікая колькасць.
**Еўфра́т** — рака ў Турцыі, Сірыі, Іраку.
**Шлях з вара́гаў у грэ́кі** — вялікі (больш за 3 тыс. км) водны шлях Старажытнай Русі, які звязваў Варажскае (Балтыйскае) мора з Рускім (Чорным) морам.
**Дыяме́нт** — алмаз, брыльянт.
**Згу́ба** — смерць, гібель, знішчэнне.
**Адшчапе́нец** — чалавек, які адышоў ад свайго калектыву, парваў сувязь са сваім асяроддзем.
**Здра́дзіць** — перайсці на бок ворага; парушыць вернасць.



## У кнігарні

*Кастусь Цвірка*

Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай.
На паліцах — безліч кніг!
Тоўстых, тонкіх — розных самых,
Цэлы свет — у кніжках тых!

— Я куплю табе во гэту...
Гэту й гэту варта ўзяць...




Ты пра ўсе краіны свету
З гэтых кніжак будзеш знаць.

Пра Аўстралію, Аляску,
Чылі, Індыю, Кітай.
Пра Еўфрат во нават казка...
Толькі, сын, бяры чытай.

— О, як добра! Дзякуй, мама!
Я пра іх чытаць люблю.
Толькі б знаць хацеў таксама
Я й пра нашую зямлю.

Пра яе лясы і рэкі,
Пра забытыя гады́,
Пра той шлях з варак у грэкі
І пра казкі-гарады.



Правообладатель Академия образования



І яшчэ — за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне —
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне.

То ж Айчыны нашай мова,
Мова прадзедаў, бацькоў.
У той мове што ні слова —
Дыяме́нт жывы вякоў.

Ці паляк, ці грэк, ці швед там —
Мова ў кожнага свая.
Як усе, хацеў бы ведаць
Мову родную і я.

За яе, за край наш любы
У бітвах гінулі дзяды.
І яе ў баях ад згу́бы
Адстаялі назаўжды.

Невук — хто яе не цэніць.
Ці ж магу я здраджваць ёй:
Я ж не нейкі адшчапенец,
Я ж не нейкі чужаземец
На святой зямлі сваёй.

?

1. Хто з'яўляецца апавядальнікам у вершы: паэт ці герой яго твора? Дакажыце.
2. Куды наведаліся сын і маці? Чым кнігарня адрозніваецца ад бібліятэкі?

3. Кнігі якой тэматыкі маці прапанавала купіць сыну?
4. Прачытайце адказ, які даў сын маці. Што можна сказаць пра сына на аснове яго адказу? Выберыце адпаведныя пункты адказу:
   а) вызначаецца начытанасцю;
   б) цікавіцца гісторыяй не толькі свайго народа, але і іншых краін;
   в) прыхільнік роднай беларускай мовы;
   г) па-сапраўднаму любіць сваю Радзіму.
5. Якая з тэм, узнятых паэтам у вершы, з'яўляецца галоўнай? Дакажыце:
   а) тэма чытання кніг;
   б) тэма сучаснасці і гістарычнага мінулага беларускага народа;
   в) тэма захавання і развіцця беларускай мовы;
   г) тэма Радзімы.
6. У чым заключаецца асноўная думка верша Кастуся Цвіркі?
7. Разгледзьце ілюстрацыі на с. 105 і 106 да твора. Ці адпавядаюць яны яго зместу?
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша па ролях. Паспрабуйце падабраць адпаведную інтанацыю падчас чытання слоў маці і сына.

**Творчае заданне. 1.** Па магчымасці праінсцэніруйце верш «У кнігарні». **2.** Паспрабуйце скласці свой верш (4-6 радкоў) пра прыгажосць беларускай мовы або прысвяціце яго нейкаму цікаваму слову або выразу.



Правообладатель Академия образования

***Маўленчая размінка.*** Выразна прачытайце паэтычнае выказванне пісьменніцы пра беларускае слова. Правільна вымаўляйце гукі [ц’], [г], [ў], [ч]; спалучэнне літар ***тч*** вымаўляйце як [чч].

Патлумачце сэнс гэтага выказвання.

Давай**це** не **ц**ураца нашай мовы,
Заўжды на мове роднай разма**ўляць**,
Бо хіба ёс**ць** пяш**ч**отней што, **чым** словы,
Якія з вуснаў ма**тч**ыных **гучаць**.

*Лёля Багдановіч.*

**Цура́цца** — адракацца ад каго- ці чаго-небудзь.
**Абся́г** — прастора, якую можна акінуць, ахапіць вокам; абша́р, далягля́д.
**Былі́на** — даўнейшая народная песня пра подзвігі асілкаў (*рус.* богатырей), герояў.



## Любіце мову

*Леанід Дайнека*

Дрыжыць прастор нябёс грамовых.
У родны край ідзе вясна.
Я зноў пра мову, зноў пра мову —
Яна, як маці, у нас адна.

Каб цэлы свет не здаўся вузкім,
Каб годна жыць паміж людзей,
Любіце мову беларускую,
Любіце з кожным днём мацней.

У ёй абсяг бароў былінных
І поля мудрая душа.
То мова доктара Скарыны,
То мова дзеда Талаша.

Яна — жыцця першаснова.
Яна — стагоддзяў зорны дым.
Калі забудзем, згубім мову,
Што скажам праўнукам сваім?


*Ф. А. Мадораў.* Дзед Талаш

Дзед Талаш — Васіль Ісакавіч Талаш — удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, народны герой Беларусі.

1. Якім пачуццём прасякнуты гэты верш?
2. Якой вам уяўляецца асоба паэта? Чым ён устрывожаны? Ці раздзяляеце вы яго думкі? Чаму?
3. Як паэт гаворыць пра мову?
4. Прачытайце радкі, з дапамогай якіх аўтар пераконвае чытача любіць мову.
5. Як вы разумееце выразы: «каб цэлы свет не здаўся вузкім», «абсяг бароў былінных і поля мудрая душа»?
6. Чаму паэт называе беларускую мову мовай Скарыны і дзеда Талаша? Патлумачце.
7. Вызначце асноўную думку верша.
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора.



Правообладатель Академия образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Алега Вароніна «У палоне прыгод».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Хто з'яўляецца галоўным героем мастацкага палатна? Апішыце знешні выгляд хлопчыка: узрост, адзенне, колер валасоў, паставу.

2) Па чым можна меркаваць, што герой карціны знаходзіцца ў дамашняй бібліятэцы? У які час сутак? Дакажыце.

3) Чым хлопчык заняты? Якія прадметы знаходзяцца на стале? Якія з іх нерэальныя, прыдуманыя мастаком?

4) Чаму галоўны герой не ўсхапіўся ад хваль вады і не ўцёк з пакоя?

5) Ці падабаецца вам назва карціны? Які загаловак твору жывапісу далі б вы? Патлумачце.

## ПРЫКАЗКІ ПРА СЛОВА І КНІГУ

- Ласкавае слова што дзень ясны.
- Рана загоіцца, а злое слова — ніколі.
- Ласкавае слова саладзей пірага.
- Добрае слова грэе нібы сонца ў вясновы дзень.
- Добрыя словы надоўга запомняцца, а злыя — назаўжды.
- Добрае слова дапамагае, як кій у дарозе.
- Ласкавыя словы для чалавека, што дождж зямлі ў засуху.
- Ласкавае слова даражэй багацця.
- Слоўка, як птушка: выпусціў — не вернеш.
- Слова сказаў — сякерай адсек.
- З кнігаю жыць — век не тужыць.
- Добрая кніга — лепшы сябар.
- З кнігай павядзешся — розуму набярэшся.

## ЗАГАДКІ

Родная, матчына.
Што ні вазьмі —
Усё называе нам,
Робіць людзьмі.
*Міхась Пазнякоў.*




Разумная, добрая, шчырая,
Стварае яе чалавек.
Дарогу да ведаў адкрые нам,
Сяброўкаю стане навек.
*Міхась Пазнякоў.*





Правообладатель Академия образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем...***

**1.** У якіх з пералічаных твораў пісьменнікі паказваюць прыгажосць, багацце і адметнасць гучання асобных беларускіх слоў?

а) «У кнігарні» Кастуся Цвіркі;
б) «Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі» Сяргея Зелянко;
в) «Як з’явіўся апостраф» Алены Масла;
г) «Любіце мову» Леаніда Дайнекі.

**2.** Назавіце творы, у якіх аўтары так выказалі сваё захапленне роднай мовай, любоў і прыхільнасць да яе:

а) «Як сустрэнеце цяпер, сябры, апостраф у словах, ведайце — гэта і ёсць адбіткі зоркі і месяца, сабраныя Дзеясловам і ўплеценыя ў мову.

Сталі завушнічкі ў словах звінець крышталём начной расы, пераліваццa месяцовым ззяннем, клікаць за сабой у нябесную высь, да зорак. І без таго прыгожыя, сталі словы звонкімі, як салаўіныя песні, на якіх начная раса замешаная»;

б) Невук — хто яе не цэніць.
Ці ж магу я здраджваць ёй:
Я ж не нейкі адшчапенец,
Я ж не нейкі чужаземец
На святой зямлі сваёй;

в) У ёй абсяг бароў былінных
І поля мудрая душа.
То мова доктара Скарыны,
То мова дзеда Талаша.

**3.** Хто з'яўляецца аўтарам твора, у якім раскрываюцца прычыны паходжання асобных новых слоў?

**4.** Устанавіце адпаведнасць паміж творамі і жанрамі.

| Назва твора | Жанр |
|---|---|
| а) «Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі»<br>б) «Як з'явіўся апостраф»<br>в) «У кнігарні»<br>г) «Любіце мову» | 1. Казка<br>2. Апавяданне<br>3. Верш |

**5.** Успомніце назвы твораў, з якіх узяты наступныя радкі:

а) І яшчэ — за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне —
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне;

б) Яна — жыцця першааснова.
Яна — стагоддзяў зорны дым.
Калі забудзем, згубім мову,
Што скажам праўнукам сваім?

***Разважаем...***

**1.** Якія жыццёвыя ўрокі вы атрымалі пасля знаёмства з творамі гэтага раздзела? Які з твораў вам асабліва запомніўся і спадабаўся? Чаму?

**2.** Чаму вучыць вас казка Алены Масла «Як з'явіўся апостраф»?

**3.** Якая з прачытаных кніг стала вашай любімай? Чаму вы параілі б яе прачытаць іншым?



Правообладатель Академия образования

**4.** Разгледзьце фотаздымкі помнікаў кнігам. Чаму людзі розных краін вырашылі ўшанаваць іх менавіта так?




Помнік кнізе
ў Каршы.
Узбекістан



Помнік кнізе
ў Санкт-Пецярбургу.
Расія



Помнік беларускай
пісьменнасці ў Барысаве



Помнік кнізе ў Кітаі

# ЧАЛАВЕК І МАСТАЦТВА



Мастацкі дух ніколі не памрэ.
Не пахаваць яго пад курганамі,
Не вычарпаць гадамі і вякамі.

*Алесь Дудар*

Пры вывучэнні раздзела:

✓ **пазнаёмімся** з асаблівасцямі некаторых фальклорных твораў; будзем раскрываць сэнс народных параўнанняў і ўстойлівых выразаў;

✓ **будзем вучыцца** фармуляваць тэму і асноўную думку твораў; вызначаць адносіны аўтара твора да падзей і герояў.

**Варта задумацца.** У чым чарадзейная сіла мастацтва? Навошта чалавеку мастацтва?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю нацюрморта Уладзіміра Хадаровіча.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Што такое нацюрморт? Назавіце прадметы, з якіх складаецца нацюрморт.

2) Якія віды мастацтва ўвасабляюць гэтыя прадметы? (Для даведкі: *музыка, жывапіс і графіка, мастацкая літаратура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, скульптура*.)

3) Што, на ваш погляд, могуць сімвалізаваць на карціне скрыпка, ручнік і збанок з саламянымі кветкамі?

4) Якія віды народных рамёстваў прадстаўлены ў нацюрморце?

5) Прыдумайце сваю назву гэтай карціне. Чаму вы далі б ёй такую назву?

6) Якія ўражанні выклікаў у вас гэты твор жывапісу?

**Успомніце.** Якія беларускія народныя і аўтарскія песні вы ведаеце з урокаў літаратурнага чытання і музыкі? Праспявайце асобныя з іх. Якую ролю, на вашу думку, адыгрывае ў жыцці чалавека песня? Паразважайце.

## Адкуль песня беларуская

*Легенда*

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта. Прыслухаўся першы:

— Відаць, жаваранак.

— Не, — кажа другі, — гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

— Ды гэта ж зямля наша спявае.

*Пафантазіруйце.* Прыдумайце працяг легенды. Што, на вашу думку, на самай справе спявала?

?

1. Што нагадала пачутая мелодыя першым двум падарожнікам?
2. Як вы разумееце словы трэцяга падарожніка — «зямля наша спявае»?
3. Адкажыце, адкуль песня беларуская.



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны беларускага мастака Міхаіла Савіцкага «Калыханка».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Хто паказаны на карціне?

2) Якія прадметы сведчаць, што перад намі жанчына-беларуска?

3) Які ў яе настрой? Чаму вы так думаеце?

4) Што за рэчы знаходзяцца побач з жанчынай і дзіцём? Для чаго выкарыстоўвалі людзі ў даўнія часы драўлянае вядро і калыску?

5) Чаму, на вашу думку, жанчына адлюстравана на фоне печы?

6) Які настрой выклікала ў вас карціна Міхаіла Савіцкага «Калыханка»? Чаму?

**Стра́та** — пазбаўленне чаго-небудзь, прапажа, згуба.

## Народ і песні

*Анатоль Грачанікаў*

Вякамі стра́ты лічыла
Айчына мая, Айчына.
Як бы ні бедавала,
А песні яна спявала.

Як кажуць сярод людзей,
Без песні — няма надзей.
Народ без песні — не ўмее,
Народ без песні — нямее.

Без песень свайго народа
Нямее нават прырода.
Ты любіш народ свой і край?
Песні яго спявай!

Вякамі раны лячыла,
Айчына мая, Айчына.
Змагалася, ваявала,
А песні ўсё ж спявала.



**1.** Растлумачце сэнс радкоў:
- Вякамі стра́ты лічыла
  Айчына мая, Айчына;
- Вякамі раны лячыла,
  Айчына мая, Айчына;
- Без песні — няма надзей.
  Народ без песні — не ўмее,
  Народ без песні — нямее.



Правообладатель Академия образования

2. Чаму «без песень свайго народа нямее нават прырода»?
3. Паразважайце, дзякуючы каму беларуская песня жыве, не знікае.
4. Да чаго паэт заклікае чытача? Ці згодны вы з думкай аўтара?
5. Якую беларускую народную ці аўтарскую песню вы ведаеце на памяць, любіце спяваць? Паспрабуйце праспяваць яе.

Кожны год на старажытнай віцебскай зямлі праходзіць Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар». Гісторыя яго ўзнікнення пачынаецца з 1992 года.

У праграму фестывалю ўключаны розныя жанры музыкі, тэатра, кіно, выяўленчага мастацтва і народныя рамёствы. Дэвіз фестывалю: «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення». Эмблемай міжнароднага свята з'яўляецца васілёк, стылізаваны пад ноту до. Кветка сімвалізуе чысціню і хараство Беларусі.

У межах фестывалю праводзіцца Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск».

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» стаў важнай дзяржаўнай справай і штогод атрымлівае падтрымку з боку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада краіны.

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віктара Маркаўца «Свята ў Докшыцах».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Якое свята адлюстраваў мастак на карціне? Якія прадметы сведчаць, што гэта Купалле?

2) Па чым можна меркаваць, што падзеі, паказаныя на карціне, адбываюцца ў Беларусі?

3) Які выраз твару ў дзяўчыны і юнака на пярэднім плане? Чаму, на вашу думку, яны сур’ёзныя, задуменныя?

4) Што ў руках у дзяўчыны і ў хлопца? Аб чым гэта сведчыць?

5) Які настрой выклікала ў вас гэта карціна? Чаму?

6) Падбярыце іншыя назвы да гэтага твора жывапісу.



Правообладатель Академия образования

**Успомніце.** Назавіце беларускія народныя казкі, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках літаратурнага чытання раней. Чаму яны называюцца народнымі? З якіх структурных частак складаецца беларуская народная казка? Для чаго людзі прыдумалі казкі? Якая іх роля ў жыцці чалавека?

**Свяця́чы** — *тут*: той, які ярка свеціць.





## Песня і казка

*(Скарочана)*

*Янка Купала*

Песня і казка
Ходзяць у пары,
Сеюць па свеце
Дзівы і чары,

Будзяць спрасоння
Думкі дзіцячы,
Як той уранні
Промень свяця́чы.

Песня і казка,
Як у крышталі,
Свету пакажуць
Тайныя далі.

Песня і казка
Ў райскіх праявах

Шчасце збудуюць
З кветак яскравых.

Сэрца атуляць
Вечнаю ласкай...
Слухай жа, сэрца,
Песні і казкі.



1. Чаму Янка Купала апісвае ў вершы два віды народнага мастацтва — песню і казку?
2. Якую ролю, на думку паэта, адыгрываюць у жыцці чалавека песня і казка?
3. Знайдзіце ў вершы і прачытайце ўжытыя ў пераносным значэнні словы, з дапамогай якіх аўтар апавядае пра песню і казку.
4. З чым параўноўвае аўтар у вершы песню і казку?
5. Да чыйго сэрца звяртаецца паэт у апошніх радках? Патлумачце.
6. Прывядзіце прыклады са свайго вопыту, калі беларускія песні і казкі асабліва ўразілі вас.

**Кру́мкаць** — *тут*: ква́каць, як жабы.
**Сло́дыч** — прыемнае адчуванне, асалода.
**По́шчак** — водгук, рэха.
**Па́railшчына** — дармавая прымусовая праца сялян на пана.
**Ціву́н** — наглядчык за працай сялян у памешчыка ў часы прыгону; прыганяты.
**Нябо́жчык** — мёртвы чалавек.
**Хоць гаць гаці́** — вельмі многа.
**Пе́кла** — месца, дзе церпяць вечныя пакуты душы памерлых грэшнікаў.



Правообладатель Академия образования

# Музы́ка-чарадзей

## *Беларуская народная казка*

Жыў некалі на свеце адзін музы́ка. Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасучы́ валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы́ ску́бці траву перастаюць — натапыраць вушы ды слухаюць. У лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ў балоце не крумкаюць.

Паедзе на начлег — там весела: хлопцы і дзяўчаты пяюць, жартуюць — ведама, маладосць. А ноч цёплая, аж па́рыць. Любата.

Але вось музы́ка возьме ды і зайграе на сваёй дудачцы. Усе — і хлопцы, і дзяўчаты — адразу, як па камандзе, суцішацца. І кожнаму ў гэты час здаецца, што быццам нейкая слодыч улілася яму ў сэрца, нейкая невядомая сіла падхапіла яго і нясе ўсё ўгору ды ўгору — у чыстае сіняе неба, да ясных зорак.

Сядзяць начлежнікі, не зварухнуцца, забыліся, што натруджаныя за дзень рукі і ногі баляць, што голад даймае.

Сядзяць і слухаюць.

І хочацца сядзець гэтак усё жыццё і слухаць іграннe музы́кі.

Змоўкне дудачка. Ды ніхто не адважыцца і з месца скрануцца, каб не спужаць таго чароўнага голасу, што рассыпаўся пошчакам па лесе, па дуброве ды ўзнімаецца ў самае неба.

Зноў зайграе дудачка, ужо жа́ласліва. І тут такая нудота ўсіх ахопіць... Ідуць позна дамоў з паншчыны



мужчыны і бабы, пачуюць му́зыку, спыняцца, заслухаюцца. Вось так усё іхняе жыццё перад вачыма і стаіць — бядота ды гаркота, ліхі пан ды ціву́н з прыганятымі. І такі іх жаль агорне, што не толькі бабы, а і мужыкі, старыя, барадатыя, плачуць, як над нябожчыкам або нібы сынкоў у салдаты праводзяць.

Але вось музы́ка зайграе вясёлае. Пакі́даюць мужчыны і бабы косы, граблі, вілы, возьмуцца ў бокі і давай скакаць.

Скачуць людзі, скачуць коні, скачуць дрэвы ў дуброве, скачуць зоркі, скачуць хмаркі — усё скача і весяліцца.

Такі быў той музы́ка-чарадзей: што захоча, тое з сэрцам зробіць.



Правообладатель Академия образования

Падрос музы́ка, зрабіў сабе скрыпачку ды пайшоў у свет. Куды прыйдзе — пайграе, за гэта яго накормяць, напояць, як самага лепшага госця, і яшчэ на дарогу дадуць.

Доўга хадзіў так па свеце музы́ка, весяліў добрых людзей, а ліхім панам без нажа сэрца рэзаў: бо куды ён ні прыйдзе, там людзі перастаюць паноў слухаць. Стаў ён ім упоперак дарогі, як костка ў горле.

Надумаліся паны са свету яго звесці. Пачалі падгаворваць аднаго, другога, каб музы́ку забіў ці ўтапіў. Ды не знайшлося ахвотніка: простыя людзі любілі музы́ку, а прыганятыя баяліся, — думалі, што ён чараўнік.

Згаварыліся тады паны з чарцямі. А ведама: паны і чэрці — аднае шэрсці.

Ідзе аднаго разу музы́ка лесам, а чэрці наслалі на яго дванаццаць галодных ваўкоў. Заступілі яны музы́ку дарогу, стаяць, зубамі ляскаюць, вочы, як распаленыя вугалі, гараць. Няма ў музы́кі нічога ў руках, толькі пад пахаю скрыпка ў мяшэчку. «Ну, — думае ён, — канец мой прыйшоў».

---

*Пафантазіруйце.* Ці з'ядуць ваўкі музы́ку? Як ён уратуецца ад смерці?

---

Дастаў музы́ка з мяшэчка скрыпку, каб яшчэ раз перад смерцю пайграць, прыхінуўся да дрэва ды і павёў смычком па струнах.

Як жывая загаварыла скрыпка, пайшоў пошчак па лесе. Замерлі кусты і дрэвы — лістком не варух-

нуць. А ваўкі як стаялі з разяўленымі пашчамі, так і скамянелі. Слухаюць і пра голад забыліся. Перастаў музы́ка іграць, а ваўкі, як сонныя, у лес пацягнуліся.

Пайшоў музы́ка далей. Сонейка ўжо за лес закацілася, толькі яшчэ свеціць на самыя верхавінкі, быццам аблівае іх пазалотаю. Ціха, як у ву́ху. Вельмі харошы вечар.

Сеў музы́ка на беразе ракі, дастаў з мяшэчка скрыпку і зайграў. Ды так прыгожа, што заслухаліся і неба, і зямля. А калі ўрэзаў полечку, дык усё вакол давай скакаць. Зоркі мітусяцца, як зімою мяцеліца, хмаркі плаваюць па небе, а рыба так узгулялася, што рака кіпі́ць, як вада ў гаршку.

Не вытрымаў і вадзяны цар — пусціўся ў скокі. Ды так разышоўся, што вада заліла берагі; чэрці напужаліся і павыскаквалі з рачных нетраў. Усе злосныя, зубамі скрыгочуць, а нічога музы́ку зрабіць не могуць.

Тым часам бачыць музы́ка, што вадзяны цар нарабіў людзям бяды — заліў палеткі і агароды. Перастаў ён іграць, палажыў скрыпку ў мяшэчак і пайшоў далей.

Ідзе ён ды ідзе, аж вось падбягаюць да яго два панічы́.

— У нас сёння ігры́шча, — кажуць. — Пайграй нам, пане музы́ка. Мы табе заплацім, што захочаш.

Падумаў музы́ка — ноч на дварэ, начаваць няма дзе, ды і грошай няма.

— Добра, — кажа, — пайграю.



Правообладатель Академия образования



Прывялі панічы музы́ку ў палац. Бачыць ён — панічоў і паненак там хоць гаць гаці́. На стале нейкая вялікая ды глыбокая міска стаіць. Панічы і паненкі па чарзе падбягаюць да яе, памочаць палец у міску і мажуць сабе вочы.

Падышоў да міскі і музы́ка. Памачыў палец і памазаў вочы. І толькі зрабіў так, бачыць, што гэта не паненкі і панічы, а ведзьмы і чэрці, што ён не ў палацы, а ў пе́кле.

«Эге ж, — думае музы́ка, — дык вось на якое ігрышча зацягнулі мяне панічы! Ну, добра. Я ж вам зараз пайграю!»

Наладзіў ён скрыпку, ударыў смычком па жывых струнах — і тут адразу ўсё пекла ў шчэпкі разляцелася, а чэрці з ведзьмамі разбегліся хто куды.

?

1. Як рэагавалі на ігранне музы́кі жывёлы? Знайдзіце і прачытайце адпаведныя радкі ў казцы.
2. Па якіх фактах, прыведзеных у творы, можна сцвярджаць, што музы́ка-чарадзей «што захоча, тое з сэрцам зробіць»? Знайдзіце і прачытайце іх.

**3.** Назавіце рысы характару, якімі надзелены галоўны герой. Выберыце правільны адказ з прапанаваных:
а) любоў да роднай прыроды;
б) талент ігры на скрыпцы;
в) імкненне дапамагаць простым людзям;
г) імкненне да багацця, сквапнасць.

**4.** У чым заключаецца чарадзейная сіла му́зыкі?

**5.** Чаму казачнік даў магчымасць свайму герою выжыць і перамагчы паноў і чарцей?

**6.** Вызначце асноўную думку гэтай казкі:
а) прырода падуладна чалавеку;
б) людзі заўсёды праяўляюць любоў да таленавітых музы́каў;
в) сапраўднае мастацтва і таленавітыя людзі неўміручыя;
г) дабро перамагае зло.

**7.** Якая тэма з’яўляецца галоўнай у гэтым творы? Для пошуку адказу скарыстайцеся адпаведным слоўнікам-памочнікам (гл. форзац 2).

**8.** Прачытайце план. Ці ў такой паслядоўнасці адбываюцца падзеі ў казцы? Аднавіце правільную паслядоўнасць падзей у народным творы.

План

1. «Жыў некалі на свеце адзін музы́ка».
2. «...усё пекла ў шчэпкі разляцелася».
3. «Надумалі паны са свету яго звесці».
4. «Наслалі на яго дванаццаць галодных ваўкоў».
5. «Не вытрымаў і вадзяны цар».
6. «Прывялі панічы музы́ку ў палац».
7. «Падрос музы́ка, зрабіў сабе скрыпачку».



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Мікалая Багданава-Бельскага «Хлопчык са скрыпкаю».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Хто адлюстраваны на карціне? Па чым вы мяркуеце?

2) Чым юны музы́ка заняты? Чаму ў яго сумны і задумлівы выраз твару?

3) На фоне чаго паказаны музы́ка?

4) З якой мэтай, на вашу думку, мастак адлюстраваў хлопчыка на ўлонні прыроды, перад хатай?

5) Ці можа гэта мастацкае палатно з'яўляцца ілюстрацыяй да беларускай народнай казкі «Музы́ка-чарадзей»? Чаму?

**Успомніце.** Разгледзьце фотаздымкі (с. 131), на якіх адлюстраваны слуцкія паясы. Ці можна іх аднесці да твораў нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва? Растлумачце чаму. Якія яшчэ шэдэўры беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вы ведаеце? Пералічыце.

**Размы́сна** — *тут*: па-майстэрску.
**Этно́граф** — спецыяліст у галіне асаблівасцей быту, культуры, звычаяў якога-небудзь народа, мясцовасці.
**Фальклары́ст** — спецыяліст па фальклоры (вуснай народнай творчасці).
**Самату́жны** — зроблены сваімі рукамі.
**Ваяво́да** — начальнік войска, кіраўнік горада ці акругі ў старажытныя часы.
**Кафта́н** — даўнейшая двухбортная мужчынская і жаночая верхняя вопратка з доўгімі поламі і падоўжанымі рукавамі.
**По́ртκі** *(разм.)* — тое, што і штаны.



Фрагменты слуцкіх паясоў



Правообладатель Академия образования



# Слуцкія паясы

*(Скарочана)*

*Мікола Чарняўскі*

Магчыма, вам даводзілася чуць такую калыханку: «Пайшоў Лёнік у лясок, знайшоў сабе паясок слуцкае работы». Калыханка гэта — з даўніх часоў, як і сама легенда пра слуцкіх ткачых, пра іх умелыя «залатыя рукі, што тонка пра́лі, звонка ткалі ды размы́сна ўзор клалі». Хочацца яшчэ нагадаць пранікнёныя радкі Максіма Багдановіча пра ткачых:

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы...

Паясы, праўда, больш простыя, сатканыя з лёну ды воўны, меў кожны беларускі селянін. Бо пояс лічыўся, бадай, самым галоўным у тагачасным сялянскім адзенні. «Паяўленне без шапкі і портак, — пісаў вядомы беларускі этнограф і фалькларыст Нікіфароўскі, — не здзівіць старонніх так, як паяўленне без апая́скі».

Паны насілі шаўковыя паясы, што завозіліся купцамі найчасцей з Турцыі і Персіі. Вялікі попыт і высокая цана на іх прымусілі купцоў задумацца: «А ці не наладзіць выраб паясоў на месцы, дома?» Пачалі ўзнікаць саматужныя майстэрні, якія атрымалі назву «персіярні».

У гэты ж час, у сярэдзіне васямнаццатага стагоддзя, далёка пайшла слава пра тканыя паясы слуцкай

фабрыкі. А пачалося ўсё з таго, што віленскі ваявода князь Радзівіл заснава́ў у горадзе над Случчу персіярню. Для сваёй фабрыкі ён прывёз у Слуцк пе́рсаў і ту́рак. Але іх было мала. І да ткацтва паясоў пачалі далучаць мясцовых умельцаў, якіх на Случчыне было шмат, бо гэта рамяство са старажытных часоў шанавалася ў народзе, лічылася за сапраўднае мастацтва. Ткачоў часцей за ўсё набіралі з прыгонных, пад прыму́сам, надоўга разлучаючы з сям'ёй, з роднымі мясцінамі. Беларускія майстры ўнеслі ў малюнак паясоў узоры, што былі найбольш блізкія і родныя іх сэрцу, цешылі вока, зачароўвалі сваёй сціплай, але непаўторнай красой...

Ткаліся слуцкія паясы даўжынёю ад двух да чатырох з паловаю метраў, з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак, прывезеных з-за мяжы. На рагу пояса, з абодвух бакоў, ткалася метка на стараславянскай і лацінскай мовах: «Слуцк», «У горадзе Слуцку», «Зроблена ў Слуцку».

Слуцкая фабрыка працавала да 1844 года. Пасля таго як у Беларусі забаранілі насіць кафта́ны, неабходнасць у слуцкіх паясах адпала і вытворчасць іх спынілася.

Слуцкія паясы даўно сталі скарбам беларускага народнага мастацтва. Магчыма, вам давядзецца пабываць на экскурсіі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. І там вас чакае цуд — сустрэча са слуцкімі паясамі.



Правообладатель Академия образования

Не звялося знакамітае рамяство слуцкіх умельцаў. Сёння ў горадзе над Случчу працуе фабрыка мастацкіх вырабаў. І на тканых паясах, што вырабляюцца тут, можна ўбачыць малюнкі і ўзоры славутых калісьці слуцкіх паясоў, паясоў з легенды.

Як і тыя ўзоры, жыве сярод людзей і даўняя калыханка: «Пайшоў Лёнік у лясок, знайшоў сабе паясок слуцкае работы».

1. Назавіце, у якім стагоддзі князь Радзівіл заснаваў у Слуцку персіярню:
   а) у сярэдзіне 18-га стагоддзя;
   б) у 16-м стагоддзі;
   в) у 12-м стагоддзі;
   г) у 20-м стагоддзі.
2. Чаму слуцкія ткачы ўносілі ў малюнак паясоў родныя ўзоры, а не персідскія?
3. Вызначце мэту, з якой пісаўся тэкст:
   а) указаць першага заснавальніка слуцкай персіярні;
   б) раскрыць гістарычную славу нацыянальнага скарбу — слуцкага пояса;
   в) выхоўваць у чытача гонар за Радзіму;
   г) заклікаць чытача да ўдзелу ў захаванні і памнажэнні нацыянальнага багацця.
4. У канцы апавядання аўтар піша, што і ў наш час «не звялося знакамітае рамяства слуцкіх умельцаў». Чаму сучасныя случчане адрадзілі гэта рамяство — пабудавалі фабрыку мастацкіх вырабаў? Выберыце для адказу 2 сцверджанні:
   а) з мэтай захавання гістарычнай і культурнай памяці пра нашых продкаў;

б) з мэтай праславіцца, як некалі продкі;
в) на вырабе слуцкіх паясоў выхоўваць нацыянальны гонар сучасных беларусаў.

**5.** Уявіце, што вы з'яўляецеся экскурсаводам у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Што вы раскажаце замежным гасцям пра слуцкія паясы (іх памеры, выраб, узоры) і працу ткачоў?

**6.** На якую тэму напісана апавяданне? Для вызначэння тэмы пры неабходнасці скарыстайцеся слоўнікам-памочнікам, што знаходзіцца на форзацы 2.

**7.** Вызначце, у якой з пералічаных кніг можа сустрэцца інфармацыя пра слуцкія паясы. Выберыце толькі адзін адказ з ліку прапанаваных:
а) сямейны даведнік;
б) тлумачальны слоўнік;
в) этнаграфічная энцыклапедыя;
г) энцыклапедыя «Вакол свету».




Сяргей Гуміляўскі. Помнік ткачу;
помнік «Адраджэнне слуцкага пояса»



Слуцкі пояс
на князю



Правообладатель Академия образования

***Маўленчая размінка.*** Прачытайце і адгадайце загадкі. У час чытання правільна вымаўляйце гукі [ц’], [ў], [ч] і [г].



Вельмі хораша спявае,
Пасвіста**ць** за**ў**жды мастак.
**Ч**орны фрак бліску**ч**ы мае.
Клі**ч**уць птушку **г**эту ... .

*Лёля Багдановіч.*



Ляці**ць**, кры**ч**ы**ць** ён:
— Крум-крум-крум!
А **ў** **г**этым крыку —
Страх і сум.

*М. Пазнякоў.*

**Ба́йка** — невялікі іншасказальны твор павучальнага характару, звычайна ў вершаванай форме.
**Канфу́з** — няёмкае становішча.
**Іміта́цыя** — майстэрскае пераймание каго- ці чаго-небудзь, дакладнае ўзнаўленне.
**Варыя́цыі** — змена рытму, мелодыі, гармоніі пры захаванні асноўнай тэмы.
**Шрот** — *тут*: дробныя барабанныя гукі, падобныя на падзенне дробных свінцовых шарыкаў, што служаць зарадам для паляўнічых стрэльб.
**Пагарджа́ць** — адносіцца да каго- ці чаго-небудзь з пагардай, не лічыць вартым увагі.
**Га́ньба** — прыніжанае становішча, якое выклікае сорам.
**Мара́ль** — вывад, урок з чаго-небудзь.



## Шпачыны канфуз

*Байка*

*Эдуард Валасевіч*

Шпака прырода ані ў чым
не абышла:
І слых, і голас, і душу дала,
І крылы для палёту!
І Шпак лятаў, свае выводзіў ноты.
Ды неяк, пабываўшы за мяжой,
Такіх акордаў і мелодый нахапаўся,
У такое пер’е ён стракатае прыбраўся,
Што птушкі зачырыкалі наперабой —
Хто з зайздрасцю, хто з абурэннем.
Па лесе гамана пайшла і зацікавіла Арла.
— Ну, братка, пакажы сваё ты ўменне,
А я паслухаю ў цяньку, —
Прапанаваў Арол Шпаку.
Тут і завёў спявак з натхненнем:
То як Калібры, то як Какаду,
То імітыраваў Фламінга, то Тукана,
То Кошкай мяўкаў нейкую нуду,
То шротам сыпаў барабана —
Аж водгулле грымела над ляском...
— Нішто сабе. Займальна.
Заморскае схапіў ты дасканальна.
А зараз — заспявай Шпаком!
І дзіва —
Не толькі варыяцыі і пералівы,
Шпак і мелодыю сваю забыў...



Правообладатель Академия образования

Тады Арол загаварыў
З дакорам:
— Якая га́ньба! Ну і сорам!
Спрадвеку птушкі славяць родны гай,
А ты злятаў разок за мора —
Дык стаў не Шпак, а Папугай...
Запомні, зарубі сабе на дзюбе:
Хоць сто матываў іншых знай,
А песняй роднаю, мой любы, —
Не пагарджай!

Скажу на чысціню, як адсяку:
Не спадабля́йся гэткаму Шпаку!



1. Хто галоўныя героі байкі?
2. Якімі яны паказаны ў творы? Прачытайце, як апісвае аўтар Шпака.
3. Як байкапісец адносіцца да сваіх герояў? Якія вобразныя словы і выразы дапамагаюць вам зразумець аўтарскія адносіны да іх? Як вы разумееце сэнс выразу «Запомні, зарубі сабе на дзюбе»?
4. За якія недахопы асуджаецца Шпак? Выберыце адзін адказ з прапанаваных:
   а) за гультайства;
   б) за лішняе майстэрства ў гукаперайманні;
   в) за адрачэнне ад сваёй роднай мовы і песні;
   г) за падарожжа за мяжу.
5. Як вы ставіцеся да паводзін Шпака?
6. Паразважайце, чалавека з якімі якасцямі паказаў аўтар у вобразе Шпака. Як вы разумееце сэнс гэтай байкі?
7. Якія словы ў творы з'яўляюцца вывадам, павучаннем? Прачытайце іх з захаваннем адпаведнай інтанацыі.
8. Якую важную думку аўтар імкнецца данесці да чытачоў?
9. На якую тэму напісаны твор? Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам-памочнікам для вызначэння тэм твораў (гл. форзац 2).

**Творчае заданне.** Паспрабуйце байку Эдуарда Валасевіча «Шпачыны канфуз» праінсцэніраваць. Вызначце дзеючых асоб, размяркуйце ў парах ролі. Разыграйце дыялогі.



Правообладатель Академия образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Ведаем...*

**1.** Назавіце аўтара кожнага з пералічаных твораў.

| Назва твора | Аўтар |
|---|---|
| а) «Слуцкія паясы»<br>б) «Народ і песні»<br>в) «Песня і казка»<br>г) «Шпачыны канфуз» | 1. Янка Купала<br>2. Мікола Чарняўскі<br>3. Анатоль Грачанікаў<br>4. Эдуард Валасевіч |

**2.** Пазнайце герояў твораў па наступных апісаннях:

а) Ходзяць у пары,
Сеюць па свеце
Дзівы і чары;

б) У такое пер'е ён стракатае прыбраўся,
Што птушкі зачырыкалі наперабой —
Хто з зайздрасцю, хто з абурэннем;

в) «Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасучы валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы скубці траву перастаюць...».

**3.** Суаднясіце назвы твораў і жанры.

| Назва твора | Жанр |
|---|---|
| а) «Адкуль песня беларуская»<br>б) «Музы́ка-чарадзей»<br>в) «Народ і песні»<br>г) «Слуцкія паясы»<br>д) «Шпачыны канфуз» | 1. Казка<br>2. Верш<br>3. Легенда<br>4. Апавяданне<br>5. Байка |

**4.** Назавіце творы, у якіх пісьменнікі выказалі сваё захапленне і любоў да нацыянальных духоўных і матэрыяльных скарбаў мастацтва.

**5.** Якой агульнай тэмай аб’яднаны легенда, казка, вершы, апавяданне і байка з гэтага раздзела?

**6.** У якім творы асноўная думка заключаецца ў тым, што чалавек і мастацтва павінны служыць свайму народу?

***Разважаем...***

**1.** Якія творы з гэтага раздзела ўразілі вас? Патлумачце чым.

**2.** Чым вас вабяць творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (ручнікі, куфры, слуцкія паясы)? Чаму іх трэба цаніць і берагчы?

**3.** Чаму людзі займаюцца мастацтвам? Якімі відамі мастацтва, магчыма, займаецеся вы, вашы родныя? Раскажыце пра гэта.

**4.** Што значыць быць таленавітым чалавекам? І што для гэтага, на вашу думку, патрэбна зрабіць?

Беларускі народ спрадвеку цэніць духоўнасць, асвету, кнігу.

Людзі самых розных прафесій ахоўваюць духоўныя каштоўнасці і традыцыі, дапамагаюць зберагаць і прымнажаць нацыянальны культурны здабытак сваёй краіны, выхоўваць у моладзі любоў да Айчыны. Менавіта таму ў Рэспубліцы Беларусь у 1997 годзе з’явілася ўнікальная традыцыя адзначаць заслугі выдатных асоб прысуджэннем Прэміі «За духоўнае адраджэнне». Урачыстая цырымонія ўзнагароджання традыцыйна кожны год праходзіць з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь  Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.



Правообладатель Академия образования

# ЗМЕСТ


**Чалавек і прырода** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Усход сонца. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

Жнівень. *Віктар Гардзей* . . . . . . . . . . . . . . . . . 12

Бабіна лета. *Рыгор Ігнаценка* . . . . . . . . . . . . . 15

Выпаў снег. *Іван Грамовіч* . . . . . . . . . . . . . . . . 18

Буслы. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24

Чаму пралескі сінія. *Ганна Скаржынская-Савіцкая* 27

***Праверце сябе*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

**Чалавек і яго род** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

Я — беларус. *Ніл Гілевіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

Адкуль пайшоў твой род? *Паводле Барыса Сачанкі* 38

Вавёрка піша сачыненне. *Паводле Алеся Карлюкевіча* 42

Палешукі і палевікі. *Легенда* . . . . . . . . . . . . . . 48

Бацькоўскі парог. *Анатоль Грачанікаў* . . . . . . . . 53

***Праверце сябе*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

**Чалавек і Радзіма** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

Люблю цябе, Белая Русь. *Уладзімір Карызна* . . . . . 61

Лю́бая мая Беларусь! *Паводле Янкі Сіпакова* . . . . . 63

Дарагая Беларусь. *Пятрусь Броўка* . . . . . . . . . . . . . 67

Бацька гарадоў беларускіх. *Паводле Навума Гальпяровіча* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71

Горад з белаю вежаю. *Паводле Алеся Каско* . . . . . . . 76

Люблю. *Канстанцыя Буйло* . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

***Праверце сябе*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85

**Чалавек, слова і кніга** ........................................ 89

Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі. *Сяргей Зелянко* 92

Як з’явіўся апостраф. *Алена Масла* ............... 99

У кнігарні. *Кастусь Цвірка* ........................ 104

Любіце мову. *Леанід Дайнека* ..................... 108

***Праверце сябе*** .............................................. 112

**Чалавек і мастацтва** ..................................... 115

Адкуль песня беларуская. *Легенда* ................ 117

Народ і песні. *Анатоль Грачанікаў* ................. 119

Песня і казка. *Янка Купала* ......................... 122

Музы́ка-чарадзей. *Беларуская народная казка* .... 124

Слуцкія паясы. *Мікола Чарняўскі* .................. 132

Шпачыны канфуз. *Эдуард Валасевіч* .............. 137

***Праверце сябе*** .............................................. 140

*Спіс выкарыстаных крыніц*



Правообладатель Академия образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан падручніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне падручнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Жуковіч** Мікалай Васільевіч
**Праскаловіч** Вольга Уладзіміраўна

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Падручнік для 4 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

У дзвюх частках
Частка 1

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Мастакі *В. В. Дударэнка, В. М. Горбач*
Вокладка мастака *В. В. Дударэнкі*
Мастацкі рэдактар *К. А. Тарасевіч*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *Н. В. Федарэнка, Г. М. Мазіна, А. А. Ліпскі*

Падпісана да друку 24.06.2024. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 5,0. Тыраж 129 737 экз. Заказ

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія адукацыі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/573 ад 22.02.2024. Вул. Някрасава, 20, 220040, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014. Пр. Незалежнасці, 79/1, 220013, г. Мінск